Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР І УПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР

№ 31 (487) | Субота, 5 кастрычніка 1940 года | Цана 20 кап.

Трыццаць год

Трыццаць год назад вершам «Начлежнікі пяюць» пачаў свой творчы шлях адзін з старэйшых пісьменнікаў беларускай літаратуры, буйнейшы майстар беларускай совецкай прозы і паэзіі — Змітрок Бядуля. Вось ужо трыццаць год працуе Змітрок Бядуля над узбагачэннем культуры свайго народа, з лёсам якога неразрыўна звязан і лёс яго, песняра.

Шлях, пройдзены Змітраком Бядуляй, не быў лёгкім ці прамым. У ім былі, побач з упартым і настойлівым рухам наперад, і часовыя блуканні, няўпэўненыя крокі, адхіленні ў бок ад вялікага шляху народнага мастацтва.

Змітрок Бядуля пачаў сваю творчую дзейнасць у змрочныя часы царызма. Сумленнае сэрца маладога паэта, перажыўшага ўсе цяжкасці жыцця, білася ў лад з сэрцам абяздоленага народа. З першых-жа крокаў сваёй творчасці Змітрок Бядуля ўвайшоў, як роўны сярод роўных, у групу маладых беларускіх песняроў — энтузіястаў нараджаючайся беларускай дэмакратычнай культуры. Праследуемыя царскім урадам, гэтыя маладыя паэты групіраваліся вакол газеты «Наша Ніва», якая была органам буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі на Беларусі. На старонках «Нашай Нівы», падзяляючы на роўных пачатках яе малады, непрымірымы пафас дэмакратызма, надрукаваў свае першыя вершы і апавяданні сёнешні юбіляр — Змітрок Бядуля. У гэтых вершах і апавяданнях пісьменнік выразіў свае дэмакратычныя погляды і сімпатыі, даў праўдзівыя рэалістычныя зарысоўкі сялянскай галечы і гора, стварыў рад незабыўных пейзажаў роднага краю.

Адной з самых вялікіх заслуг Змітрака Бядулі перад нашай літаратурай з'яўляецца тое, што ён побач з Янкам Купалай і Якубам Коласам значна пашырыў рамкі жанравай, бытавой «нашаніўскай» паэзіі, надаў ёй сапраўды трагічны пафас і гучанне.

У дэмакратызме паэтычнай творчасці Змітрака Бядулі заключалася магчымасць яго далейшага развіцця. Аднак к моманту Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі дэмакратычныя погляды Змітрака Бядулі прыйшлі ў войструю супярэчнасць з нацыяналістычнымі ўплывамі таго асяроддзя, у якім часова аказаўся пісьменнік. Нацыяналістычныя ўплывы не далі магчымасці Змітраку Бядулю ўбачыць сапраўдны характар социялістычнай рэвалюцыі. Змітрок Бядуля перажыў перыяд ідэйных хістанняў, перш чым прыйсці к сапраўднаму разуменню задач і мэтаў рэвалюцыйнай рэчаіснасці. І святкуючы сёння трыццацігоддзе літаратурнай дзейнасці Змітрака Бядулі, мы разам з тым адзначаем яшчэ адну перамогу ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, ажыццяўляючы якую наша комуністычная партыя, наш совецкі народ перавыхавалі лепшых прадстаўнікоў дарэвалюцыйнай дэмакратычнай інтэлігенцыі, што знаходзілася пад дробна-буржуазным нацыяналістычным уплывам. Пад непасрэдным уздзейнічаннем гігантскіх перамог соцыялізма ў нашай краіне Змітрок Бядуля прыйшоў у рады актыўных будаўнікоў новай культуры совецкага народа, соцыялістычнай па зместу і нацыянальнай па форме. Пад жыватворчым сонцам сталінскіх клопатаў аб інтэлігенцыі Змітрок Бядуля ідэйна і творча ўзмужнеў, узбагаціў совецкую літаратуру вялікай колькасцю каштоўных мастацкіх твораў.

У радзе гэтых твораў найбольш пачэснае месца займае аповесць «Салавей». Поспех аповесці «Салавей» заключаецца ў яе высокіх ідэйна-мастацкіх якасцях. У ёй Змітрок Бядуля паставіў і вырашыў праблему народнага мастацтва, якое намнога вышэй, паэтычней, бескарысней паразітычнага, утончанага мастацтва кіруючых класаў-прыгоннікаў. Велізарнае значэнне аповесці «Салавей» для нашай літаратуры заключаецца ў тым, што яна раскрывае багаты духоўны свет народа і гэтым самым уносіць шмат каштоўнага ў вопыт стварэння станоўчага героя нашай літаратуры. Аповесць «Салавей» напісана даўно, але і сёння яна гучыць свежа і паэтычна, як песня народу — багатаму, моцнаму, поўнаму актыўнай волі і дзеяння.

У перыяд сваёй совецкай творчасці Змітраку Бядулю прыходзілася яшчэ перамагаць рэцыдывы нацыяналізма, элементы «узвышэнскіх» уплываў, якія мацней за ўсё сказаліся на першым томе рамана «Язэп Крушынскі». Перамагаючы гэтыя ўплывы, Змітрок Бядуля стварае творы аб новай рэчаіснасці, навелы аб калектывізацыі, вершы аб Каўказе, аўтабіяграфічную аповесць «Набліжэнне» і, нарэшце, казкі для дзяцей, вершаваную аповесць «Хлопчык з-пад Гродна», аповесць «У дрымучых лясах» і фальклорную казку «Сярэбраная табакерка». Змітрок Бядуля працуе цяпер як ніколі шмат і плодатворна. Ён поўны маладой творчай энергіі. Пастаянная ўвага партыі і ўрада, бацькоўскія клопаты роднага Сталіна аб росце і развіцці совецкай літаратуры ўдзесяцераюць гэту творчую энергію.

За выдатныя поспехі ў справе развіцця совецкай літаратуры Змітрок Бядуля ўзнагароджан, побач з лепшымі совецкімі пісьменнікамі, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Перагортваючы старонку за старонкай, том за томам, творы Змітрака Бядулі, мы чытаем летапіс гарачага і сумленнага жыцця, благароднага чалавечага сэрца. Гэта красачны і шматгранны свет, створаны Змітраком Бядуляй, свет, у якім [illegible]ліся смелы паэтычны вымысел [illegible] абстаноўкай народнага жыцця. [illegible]овы шлях творчасці прайшоў [illegible]ля. У дзень 30-гадовага [illegible]зем яму многа, многа год творчай работы на славу нашай радзімы.

Змітрок Бядуля. Фота І. Каплінскага.

Дарагі таварыш Бядуля!

З пачуццём глыбокай павагі і гарачай братняй любві вітаюць Вас пісьменнікі Совецкага Саюза ў дзень трыццацігоддзя Вашай літаратурнай і грамадскай дзейнасці. Трыццаць год назад, у глухія, змрочныя дні царскай рэакцыі прынеслі Вы беларускаму народу свой малады, поўны веры ў народныя сілы талент паэта і празаіка. Плячо ў плячо з пачынальнікамі новай беларускай літаратуры Янкам Купалай і Якубам Коласам Вы мужна ішлі па цяжкому шляху правазвеснікаў нацыянальнага разнявалення беларускага народа. Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэвалюцыя прынесла беларусам доўгачаканую свабоду. Натхняемая вялікімі ідэямі Леніна і Сталіна, шматфарбная літаратура соцыялізма расцвітае ў Беларусі магутна і ўпэўнена. Ля калыскі гэтай новай літаратуры сталі Вы разам са сваімі паплечнікамі і саратнікамі. Разам з маладой парослю паэтаў, празаікаў і драматургаў Вы працуеце не пакладаючы рук над стварэннем мужнай, праўдзівай, насычанай ідэямі барацьбы за поўную перамогу комунізма беларускай совецкай літаратуры. За гэту маладосць, за непарыўную сувязь з жыццём любіў і любіць Вас народ. Высокай узнагародай — ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга адзначыў Совецкі ўрад Вашы заслугі пісьменніка і грамадзяніна.

Жадаем Вам невычэрпнай творчай маладосці, новых радасных поспехаў у Вашай творчай рабоце на славу роднай беларускай совецкай літаратуры, у імя перамогі вялікіх комуністычных ідэй ва ўсіх краінах, ва ўсіх народаў.

Прэзідыум Саюза совецкіх пісьменнікаў СССР.

Дарагі Змітрок Бядуля!

Праўленне Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР горача вітае Вас з 30-гадовым юбілеем плённай літаратурнай дзейнасці.

Вашы выдатныя творы адыгралі вялікае значэнне ў развіцці беларускага мастацкага слова. Вы з'яўляецеся адным з першапачынальнікаў сучаснай беларускай літаратуры.

Прайшоўшы ва ўмовах царызма цяжкі і пакутны шлях пісьменніка прыгнечанага народа, Вы з гонарам працуеце цяпер на карысць нашай вялікай з'еднанай краіны, асветленай сонцам соцыялізма.

Ваша творчасць шматліка і разнастайна. Такія Вашы творы, як «Салавей» і «У дрымучых лясах», таксама як і шмат Вашых дарэвалюцыйных навел і апавяданняў, з'яўляюцца каштоўным здабыткам совецкай літаратуры.

Радзіма чакае ад Вас новых выдатных твораў, вартых мастацтва вялікай краіны соцыялізма.

Вітаем Вас і жадаем Вам доўга жыць і плённа працаваць на карысць народа, на карысць соцыялістычнай радзімы.

Няхай жыве ленінска-сталінская нацыянальная палітыка!

Няхай жыве квітнеючая беларуская соцыялістычная культура!

Прэзідыум Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР.

Жадаем доўгіх год здароўя!

Пісьменнікі Совецкай Украіны сардэчна вітаюць Вас з 30-гадовым юбілеем літаратурнай дзейнасці. Шчыра жадаем доўгіх год здароўя, плённай работы на карысць соцыялістычнай радзімы і праслаўлення совецкай літаратуры.

Прэзідыум Саюза совецкіх пісьменнікаў Украіны.

Мінск, Змітраку Бядулю

Прэзідыум Саюза совецкіх пісьменнікаў Грузіі горача вітае Вас з трыццацігоддзем Вашай выдатнай літаратурнай дзейнасці. Ад усёй душы жадаем Вам новых і новых творчых дасягненняў, каб і ў далейшым Ваша бліскучае пяро белетрыста і паэта служыла ў нашу шчаслівую сталінскую эпоху на карысць працоўных з'еднанай Беларусі.

Прэзідыум Саюза совецкіх пісьменнікаў Грузіі.

Дарагі Змітрок!

Трыццаць год — гэта значны час, гэта — вялікі кавалак жыцця ў чалавечым веку. Трыццаць год напружанай работы ў галіне мастацкага слова — гэта вялікая справа. Шчаслівы той пісьменнік, які, аглянуўшыся на пройдзеную дарогу ва ўмовах бяспраўя і галечы, бачыць свой прасторны і шырокі шлях літаратара сёнешняга дня, дзе так ярка свеціць сонца новай сталінскай эпохі.

Я ад шчырага сэрца вітаю цябе з тваім трыццацігоддзем творчай работы. Ідзі з новай энергіяй наперад у новае жыццё. Свой талент і ўсю сваю пісьменніцкую здольнасць аддай на служэнне гэтаму жыццю і яго задачам, за якія змагаліся ў прошлым лепшыя сыны народа і якія ажыццяўляюцца сёння пад сцягам Леніна — Сталіна.

Якуб КОЛАС.

Дарагі Бядуля!

К дню трыццацігоддзя Вашай літаратурнай дзейнасці я шлю Вам—вялікаму майстру прозы, блізкаму таварышу—сваё гарачае прывітанне.

Глыбокае, незабыўнае ўражанне Вы зрабілі на мяне яшчэ ў 1911—1912 годзе ў Вільні, дзе я Вас упершыню сустрэў маладым сярод такіх-жа маладых, праследуемых царскім урадам, амаль нелегальных беларускіх пісьменнікаў. Мне не забыць Вашых першых апавяданняў, у якіх вы выражалі боль і пакуты беларускага народа. Яшчэ ў тыя годы Вы служылі нам, яўрэйскім пісьменнікам, узорам не толькі шчырага служэння мастацтву, але і ўзорам глыбокай адданасці вялікай ідэі інтэрнацыянальнага братэрства.

Ад душы вітаю Вас, дарагі таварыш Бядуля. Жадаю Вам яшчэ многа, многа год прадукцыйнай творчай працы ў галіне беларускай і ўсёй вялікай совецкай літаратуры.

Давід БЕРГЕЛЬСОН.

ШМАТ ГОД ЗДАРОЎЯ І ПЛЁННАЙ ПРАЦЫ!

Ад еўшыбота да вышынь соцыялістычнай культуры, ад жахаў царскага самаўладства да светлага, радаснага жыцця ва ўмовах соцыялізма, — вось той шлях, які прайшоў у сваім творчым жыцці Змітрок Бядуля, наш сёнешні юбіляр. Шлях доўгі і не лёгкі. Трыццаць год ішоў Змітрок Бядуля па гэтаму шляху, няроўнаму і звілістаму, часамі спатыкаўся, збіваўся з тропу, трапляў на бакавыя пуцявіны. Тады роднае неба здавалася чужым, а замест зор у вачах мільгалі зманлівыя агні, якімі ўсякая нечысць старалася прывабіць да сябе неспрактыкаванага падарожніка, збіць з роўнай сцежкі, завесці ў балота. З намаганнем выбіваўся ён на дарогу і ўпарта крочыў далей. Крочыў, акружаны замілаванымі вобразамі простых працавітых людзей, з якімі спазнаўся яшчэ будучы юнаком на зачараваных гонях роднага краю. Крочыў так, аж пакуль не выйшаў на прасторны і светлы шлях, на які вывела яго Вялікая Кастрычніцкая рэвалюцыя. Але і па гэтаму шляху Змітраку Бядулю ісці было не так лёгка, як гэта можа паказацца на першы погляд. За доўгія годы назбіралася нямала вольных і нявольных грахоў, — груз цяжкі і непрыемны, асабліва ва ўмовах новай совецкай рэчаіснасці, у святле тых грандыёзных задач, якія сталі перад совецкім народам і яго літаратурай. Прыйшлося пераглядзець увесь гэты багаж прошлага, адабраць усё тое, што можа радаваць сэрца і служыць на карысць вялікай справы соцыялізма, а памылковае адкінуць і асудзіць, як нявартае ні самога пісьменніка, ні нашай совецкай сапраўднасці.

У совецкай сапраўднасці Змітрок Бядуля чэрпае для сябе новыя сілы. Сваіх ранейшых герояў ён бачыць у новай абстаноўцы, як вольных будаўнікоў комуністычнага грамадства, і гэта натхняе яго на стварэнне поўнацэнных вобразаў совецкіх людзей.

Аглядваемся мы сёння разам з юбілярам на пройдзены ім творчы шлях і радуемся вялікім здабыткам яго творчай працы, радуемся разам з ім, што ўсё страшнае і благое засталося ў мінулым, што наш дарагі юбіляр поўны сіл і творчай энергіі, што перад ім неабмежаваныя творчыя магчымасці.

Пажадаем-жа яму шмат год здароўя і плённай працы на карысць комуністычнага грамадства.

Кандрат КРАПІВА.

ДАРАГІ ТАВАРЫШ ЗМІТРОК БЯДУЛЯ!

Ад усяе душы вітаем цябе са слаўным трыццацігоддзем літаратурнай дзейнасці. Жадаем многа год здароўя і творчага поспеху на карысць нашай дарагой радзімы.

Міхась ЛЫНЬКОЎ, Пятрусь БРОЎКА.

Дарагі Змітрок!

Ад шчырага сэрца вітаю з трыццацігоддзем літаратурнай дзейнасці. Жадаю многа-многа год здароўя, шчасця, радасці і плённай працы для соцыялістычнай радзімы.

Кузьма ЧОРНЫ.

Прывітанне юбіляру

Рэдакцыя журнала «Советышэ літэратур» сардэчна віншуе Вас, таварыш Бядуля, з слаўным юбілеем. Жадаем шмат год плённай работы на працвітанне совецкай літаратуры.

ФЕФЕР, ГОФШТЭЙН, ОРЛАНД, ПАЛЯНКЕР, ГОНТАР.

Дарагі Бядуля!

У дзень 30-годдзя Вашай творчасці горача віншую Вас — аднаго з лепшых беларускіх пісьменнікаў, паэта, празаіка, драматурга. Ад усёй душы жадаю Вам здароўя, сіл і новых творчых поспехаў на карысць нашага народа.

В. ВЛАДАМІРСКІ.
Народны артыст БССР.

Дарагі Самуіл Ефімавіч!

Саюз кампазітараў БССР з глыбокім здавальненнем адзначае 30-ю гадавіну Вашай творчай літаратурнай дзейнасці, накіраванай на служэнне беларускаму народу.

Кампазітары БССР неаднаразова карысталіся Вашымі паэтычнымі творамі для іх музыкальнага пераўтварэння, а па Вашай аповесці «Салавей» кампазітарам Кропшнерам створан балет.

Няхай-жа і ў далейшым Ваша творчасць натхнёна служыць совецкаму народу і ўзбагачае совецкую культуру творамі, вартымі сталінскай эпохі.

Ад Саюза совецкіх кампазітараў БССР А. БАГАТЫРОЎ, В. ЕФІМАЎ.

Юбіляру

«Лясоў дрымучых» шум вясёлы,
Нязўціхны шчэбет «Салаўя»,
І людзі гарадоў і сёлаў —
Вось тэма творчасці твая.
Табе прывет мы сёння шлём,
Жадаем долі мы адзінай —
Каб быў ты заўжды салаўём
Сваёй праслаўленай радзімы!

Анатоль АСТРЭЙКА.
Канстанцін ЦІТОЎ.

Прамова В. І. ЛЕНІНА на III з'ездзе комсамола і пытанні літаратуры

У 1920 годзе з 2 па 10 кастрычніка ў Маскве адбываўся III Усерасійскі з'езд комуністычнага саюза моладзі.

На першым пасяджэнні гэтага з'езда вечарам 2 кастрычніка Владзімір Ільіч Ленін зрабіў прамову, якая спачатку была надрукавана ў газеце «Правда» ад 5, 6 і 7 кастрычніка, а потым выйшла асобнай брашурай: «Н. Ленин (В. И. Ульянов). Задачи Союзов молодежи, речь на III Всероссийском с'езде РКСМ».

Дваццаць год служыла гэта прамова баявой праграмай жыцця, вучобы і выхавання нашай моладзі і зараз з'яўляецца магутным ідэйным і палітычным узбраеннем усяго совецкага народа.

Выключна актуальнае значэнне мае гэта прамова для тэорыі літаратуры.

У «Задачах саюзаў моладзі» Владзімір Ільіч сфармуліраваў важнейшае пытанне комунізма — пытанне аб культурнай спадчыне і гэтым самым вызначыў шляхі літаратурнага жыцця Совецкага Саюза.

Яшчэ ў сакавіку 1919 года Ленін гаварыў: «...Трэба ўзяць усю навуку, тэхніку, усе веды, мастацтва. Без гэтага мы жыццё комуністычнага грамадства пабудаваць не можам» (т. XXIУ, стар. 65). У выступленні перад пакаленнем, якому тады, па словах Леніна, было «15 год і якое праз 10—20 год будзе жыць у комуністычным грамадстве», Ленін і паказаў як трэба вучыцца комунізму, як трэба будаваць жыццё комуністычнага грамадства і як трэба ствараць сваю, пролетарскую, соцыялістычную культуру і літаратуру.

Ленін гаварыў: «...Без яснага разумення таго, што толькі дакладным веданнем культуры, створанай усім развіццём чалавецтва, толькі перапрацоўкай яе можна будаваць пролетарскую культуру — без такога разумення нам гэтай задачы не вырашыць.

Пролетарская культура не з'яўляецца выскачыўшай невядома адкуль, не з'яўляецца выдумкай людзей, якія называюць сябе спецыялістамі па пролетарскай культуры. Гэта ўсё суцэльная бязглуздзіца. Пролетарская культура павінна з'явіцца законамерным развіццём тых запасаў ведаў, якія чалавецтва выпрацавала пад гнётам капіталістычнага грамадства, памешчыцкага грамадства, чыноўніцкага грамадства» (т. XXX, стар. 406). Гэтым Владзімір Ільіч рашуча высмейваў і разбіваў нікчэмныя ўстаноўкі пролеткультаўцаў, якія прытрымліваліся «камерных спосабаў» стварэння пролетарскага мастацтва і культуры, па-за сувяззю з жыццём і барацьбой народа, і — выкрываў ілжывыя і шкодныя намеры тых гора-тэарэтыкаў, якія альбо зусім адмаўлялі значэнне культурнай спадчыны, альбо імкнуліся задачу крытычнага асваення папярэдняга мастацтва і культуры падмяніць рабскім падражаннем і штучным пераманнем старых эстэтычных прынцыпаў і догмаў.

Ленін раз'ясняў, што цаніць культурную спадчыну — не значыць абмяжоўвацца гэтай спадчынай. Задача састаіць у тым, каб на аснове крытычнага асваення ўсяго папярэдняга мастацтва і літаратуры зрабіць новы крок у мастацкім развіцці чалавецтва, прасунуцца наперад і стварыць свае асобыя, соцыялістычныя ўстаноўкі, нормы, формы, метады ў паэзіі, мастацтве і культуры.

Ставячы задачу крытычнага авалодання культурнай спадчынай, Ленін часта і настойліва падкрэсліваў: не замыкацца ў рамках адной нацыянальнасці, а ўсебакова вывучаць сусветную культуру, культуру ўсіх народаў. Ленін гаварыў: «...Мы **з кожнай** нацыянальнай культуры бярэм **толькі** яе дэмакратычныя і яе соцыялістычныя элементы, бярэм іх **толькі і безумоўна** ў процівагу буржуазнай культуры, буржуазнаму нацыяналізму **кожнай** нацыі» (т. XVII, стар. 137).

Ленінская прамова на III з'ездзе комсамола вызначыла кроўныя жыццёвыя задачы совецкай моладзі і формы яе арганізацыі, сфармуліравала прынцыпы совецкай этыкі, маралі, педагогікі і паклала асновы мудрай палітыкі партыі ў галіне мастацкай літаратуры.

Ленінскае вучэнне пра культурную спадчыну адыграла вялікую ролю ў выпрацоўцы нашай літаратурай метада соцыялістычнага рэалізма, які і з'явіўся вынікам крытычнага асваення ўсёй класічнай літаратуры, вынікам ажыццяўлення нашымі пісьменнікамі ў сваёй творчасці вучэння класікаў марксізма-ленінізма аб літаратуры.

Грамадска-палітычная функцыя прамовы Леніна рашуча пацвярджае тое гістарычнае палажэнне таварыша Сталіна, што марксісцка-ленінская тэорыя ператвараецца ў сапраўды вялікую сілу, калі ёй авалодваюць масы.

Ів. ГУТАРАЎ.

Авалодаць скарбніцай марксізма-ленінізма

Уся наша краіна адзначае другую гадавіну з дня выхаду ў свет «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» — сталінскай энцыклапедыі асноўных ведаў у галіне марксізма-ленінізма. «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)» стаў настольнай кнігай мільёнаў совецкіх людзей.

«Кароткі курс гісторыі ВКП(б)» вывучае ўся совецкая інтэлігенцыя. Совецкія пісьменнікі праяўляюць вялікую цікавасць да рэвалюцыйнай тэорыі, без авалодання якой нельга плённа працаваць у галіне літаратурнай творчасці.

Партарганізацыя Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР правяла значную работу па дапамозе пісьменнікам, якія вывучаюць «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)» і творы класікаў марксізма-ленінізма.

Пачынаючы з студзеня гэтага года, партарганізацыя ССПБ праводзіць два разы ў месяц тэарэтычныя гутаркі па «Кароткаму курсу гісторыі ВКП(б)». У гэтых гутарках прымалі ўдзел комуністы т. т. Мазо, Вітаўтаў, Агняцвет, Рудзько, комсамольцы т.т. Кучар, Бярозкін, Мальцінскі, Груб'ян, Шведзік, група беспартыйных літаратараў — т.т. К. Чорны, А. Якімовіч, Ф. Шынклер, М. Ільінскі і іншыя. Кіруе тэарэтычнымі гутаркамі тав. І. Гурскі.

Праведзены тэарэтычныя гутаркі па 9-ці раздзелах «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)». Паасобныя таварышы актыўна і сур'ёзна ставяцца да авалодання марксізмам-ленінізмам. Асабліва ўдумліва рыхтуюцца да заняткаў і актыўна ўдзельнічаюць у іх т.т. Шынклер, Бярозкін, Рудзько. Дадатным у падрыхтоўцы да гэтых гутарак з'яўляецца тое, што таварышы, вывучаючы «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)», вывучаюць разам з тым творы Леніна і Сталіна.

Партарганізацыя правяла таксама тэарэтычныя канферэнцыі па творах В. І. Леніна: «Шаг вперед, два шага назад», «Что делать?», «Две тактики социал-демократии в демократической революции» и трохдзённую тэарэтычную канференцыю па біяграфіі таварыша Сталіна.

У тэарэтычных канферэнцыях па творах Леніна і біяграфіі таварыша Сталіна прынялі ўдзел, апрача комуністаў т. т. Клімковіча, Лебедзева, М. Лынькова, Стаховіча, Вольскага, Гурскага, Агняцвет, таксама беспартыйныя пісьменнікі т.т. Кузьма Чорны і Змітрок Бядуля.

У нашай рабоце па прапагандзе марксізма-ленінізма ёсць яшчэ сур'ёзныя недахопы. Яшчэ мала пісьменніцкага актыва ўдзельнічае ў тэарэтычных гутарках па гісторыі партыі. Не наладзілі мы яшчэ сталай кваліфіцыраванай дапамогі таварышам, якія самастойна вывучаюць «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)» і творы класікаў марксізма-ленінізма. Пісьменнікі не наведваюць платных лекцый у Доме партыйнага актыва.

Задачай нашай партарганізацыі з'яўляецца такая арганізацыя работы па прапагандзе марксізма-ленінізма, якая-б забяспечыла штодзённую дапамогу ўсім пісьменнікам па авалоданню марксісцка-ленінскай тэорыяй.

Сталінскі «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)» ідэйна загартоўвае нашы кадры, натхняе на творчую работу і барацьбу за новыя перамогі комунізма. «Вывучэнне гісторыі ВКП(б) умацоўвае ўпэўненасць у канчатковай перамозе вялікай справы партыі Леніна — Сталіна, перамозе комунізма ва ўсім свеце» («Кароткі курс гісторыі ВКП(б)»).

Абавязак кожнага партыйнага і непартыйнага большэвіка авалодаць вялікай скарбніцай марксізма-ленінізма, якой з'яўляецца сталінскі «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)».

М. МОДЭЛЬ.
Сакратар партарганізацыі ССП БССР.

„ШТАНДАР ВОЛЬНОСЦІ“

З 1-га кастрычніка пачала выходзіць рэспубліканская грамадска-палітычная і літаратурная газета на польскай мове «Штандар вольносці» («Сцяг свабоды»). У складзе рэдкалегіі газеты польскія пісьменнікі: Канстанты Ансэльм, Яніна Бранеўская, Тэафіль Главацкі.

Выхад газеты «Штандар вольносці»— новае яскравейшае сведчанне бацькоўскіх клопатаў партыі Леніна—Сталіна да развіцця культуры ўсіх народаў нашай радзімы. У братняй сям'і народаў пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі працоўныя палякі актыўна ўдзельнічаюць у соцыялістычным будаўніцтве, плённа развіваюць сваю нацыянальную па форме і соцыялістычную па зместу культуру.

У першых нумарах газета дала для сваіх чытачоў цікавы і разнастайны матэрыял. Змешчаны вершы, апавяданні, нарысы Т. Главацкага, Я. Бранеўскай, В. Найдус, Г. Дабжынскай, артыкулы прадстаўнікоў мастацкай інтэлігенцыі рэспублікі—засл. дзеяча мастацтваў БССР В. Волкава, мастацкага кіраўніка Дзяржаўнага польскага тэатра лялек В. Ярэма і інш.

Пажадаем газеце «Штандар вольносці» поспеху ў яе пачэснай рабоце па большэвіцкаму выхаванню сваіх чытачоў— працоўных палякаў!

У партарганізацыі ССП БССР

На сходзе партарганізацыі ССП БССР 3 кастрычніка быў заслухан і абмеркаван справаздачны даклад сакратара партарганізацыі ССП БССР тав. Модэля аб рабоце за поўгода.

Даклад, у якім была дадзена характарыстыка творчай дзейнасці раду пісьменнікаў, комуністаў і беспартыйных, і акрэслены задачы нашай літаратуры, выклікаў ажыўленыя спрэчкі. У абмеркаванні прынялі ўдзел тт. Лынькоў, Броўка, Куляшоў, Рудзько, Лебедзеў, Клімковіч, Гурскі, Мазо, Крапіва, Гусеў і Васілеўскі (ЦК КП(б)Б).

Выступаўшыя падвергді крытыцы дзейнасць праўлення і партарганізацыі ССП БССР, якія не паставілі ў цэнтры сваёй увагі разгляд канкрэтных твораў пісьменнікаў, работу па ідэйнаму і мастацкаму выхаванню ўсіх пісьменнікаў — і старэйшага пакалення і моладзі. Адзначана слабасць нашай крытыкі, якая дасюль не дала рашучага адпору людзям, што працягвалі ў нашу літаратуру палітычна-шкодную халтуру і пашляціну (многія апавяданні А. Алешкі, рад твораў М. Ільінскага), якая недастаткова прынцыпова ў ацэнцы асобных няўдач пісьменнікаў (раман «Салаўі святога Палікара» Р. Мурашкі), якая не ўзняла пытанняў, звязаных з паказам станоўчага героя ў нашай літаратуры, мала займаецца пытаннямі творчага выхавання маладых і пачынаючых пісьменнікаў. Указана на тое, што абмеркаванне пытанняў паэзіі, пачатае на старонках газеты «Літаратура і мастацтва», не знайшло яшчэ шырокага водгуку сярод пісьменнікаў. Гаворачы аб змешчаных артыкулах, выступаўшыя падвергді крытыцы няправільна арыентыруючыя пісьменнікаў ацэнкі лірыкі, дадзеныя А. Кучарам у артыкуле «Лірычны штамп». Патрэбна прыцягнуць да абмеркавання пытанняў паэзіі больш шырокі круг літаратараў, у прыватнасці крытыкаў-комуністаў. Патрэбна разгарнуць дыскусію па пытаннях літаратурнай формы.

Сход прызнаў работу партарганізацыі за справаздачны перыяд здавальняючай.

ЗМІТРОК БЯДУЛЯ

(Да 30-годдзя яго творчай дзейнасці)

Ю. ДВОРКІНА

23 верасня 1910 года ў беларускай газеце «Наша Ніва» была надрукавана невялічкая лірычная імпрэсія «Пяюць начлежнікі», падпісаная **Самуілам Плаўнікам.** Так пачалася творчая дзейнасць аднаго з старэйшых беларускіх пісьменнікаў Змітрака Бядулі, якога можна з поўным правам, побач з Якубам Коласам і Янкам Купалай, лічыць заснавальнікам сучаснай беларускай літаратуры.

Вялікі і складаны шлях прарабіла беларуская літаратура за гэтыя 30 год. Ад перыяду збірання творчых сіл беларускага народа вакол «Нашай Нівы», уздыму нацыянальна-вызваленчага руху ў часе першай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі і да нашых дзён, калі беларуская літаратура, соцыялістычная па зместу і нацыянальная па форме, квітнее і развіваецца як роўная сярод роўных літаратур нашай магутнай шматнацыянальнай радзімы, імя З. Бядулі было шчыльна звязана з развіццём беларускага літаратурнага і культурнага жыцця.

Ранні перыяд творчасці пісьменніка і паэта Бядулі-Ясакара шчыльна звязан з газетай «Наша Ніва», органам беларускага нацыянальна-вызваленчага руху. «Наша Ніва» і яе выданні былі адзіным друкаваным органам, у якім беларускія пісьменнікі маглі пісаць на сваёй роднай мове.

З. Бядуля прышоў у літаратуру ў змрочныя часы рэакцыі, якая панавала ў краіне. Настроі суму, адчаю, незадаволенасці рэчаіснасцю гучалі ў тыя часы ў творчасці паэтаў і пісьменнікаў, прадстаўнікоў дробна-буржуазнай інтэлігенцыі, якія балюча перажывалі разгром рэвалюцыі, якія не жадалі змірыцца з рэакцыяй, але разам з тым і не ведалі шляхоў барацьбы, бо не былі звязаны з адзінай у той час партыяй, якая цвёрда верыла ў перамогу рэвалюцыі, якая бадзёра глядзела ўперад, г. зн. з партыяй большэвікоў.

Няведанне шляхоў, шуканне выйсця з цяжкіх умоў існавання і адсутнасць адказу на гэта пытанне парадзілі разгубленасць, песімізм у радах рускай дробнабуржуазнай інтэлігенцыі. У часы рэакцыі ўзмацняюцца такія літаратурныя плыні, як сімвалізм, дэкадэнцтва, якія сведчаць аб жаданні знайсці ў мастацтве выхад, шукаць лепшае ў свеце рамантычнага вымыслу, у містычным, зачараваным свеце, які сам для сябе стварае паэт.

Пад непасрэдным уплывам рускай літаратуры развіваюцца і літаратурныя плыні беларускай літаратуры, узнікае літаратура беларускага сімвалізма. Але, скарыстоўваючы лепшыя дасягненні рускіх сімвалістаў, беларускія сімвалісты ніколі не гублялі сваіх дэмакратычных поглядаў, сваёй сувязі з народам, ніколі не даходзілі да такой пагарды к чалавецтву, як гэта было ў асобных рускіх сімвалістаў.

Найбольш таленавітымі прадстаўнікамі гэтай літаратурнай плыні (праўда, гаварыць аб сімвалізме ў Беларусі можна толькі ўмоўна) былі такія паэты, як Максім Багдановіч і Бядуля-Ясакар. Чамусьці ў нашай літаратурнай крытыцы зусім не звярталася ўвагі на багатую паэзію Бядулі нашаніўскіх часоў. А тагочасныя вершы паэта — выдатныя па сваёй высокай культуры, па мастацкай дасканаласці іх апрацоўкі.

Галоўны струмень, які пераважае ў тагочаснай лірыцы Ясакара, — струмень рамантычны, блізкі да рускіх імпрэсіяністаў і сімвалістаў. Паэт стварае сабе рамантычныя светы, куды імкнецца адыйсці ад шэрай, цяжкой рэчаіснасці; паэт стварае прыгожыя казкі, якімі жыве яго душа. Іншы раз гучаць і містычныя матывы ў яго творах («Дзіця рая», «А ў бары», «У муках», «Мініятуры», «Абразкі»). Але паэт, у адрозненне ад рускіх сімвалістаў, ніколі не губляў сувязі з рэальнасцю, заўсёды адчуваючы, што казка, прыгожы вымысел ніколі не аднясуць чалавека ад жыцця.

Сумныя настроі, пытанне «куды ісці, дзе знайсці выхад» не сыходзіць з вуснаў маладога паэта, так балюча адчуваючага сваё адзіноцтва, адарванасць ад свету.

> Вільготнаю лучынаю
> Дымяць мае гады.
> А дзверы ўсе зачынены.
> Куды ісці, куды?
> Пад гурбамі-заховамі
> Жыву і не жыву.
> Хачу чагосьці новага —
> Парву ланцуг — парву.

Сум па прыгажосці, настроі паэта гучаць у шматлікіх вершах Ясакара, як, напрыклад, «У зімовы дзень», «Палумесяц арэ залатыя барозны», у сімвалічным вершы «Доч месяца» ды іншых.

Асабліва выразіліся тагочасныя рамантычныя імкненні і настроі паэта ў яго вядомым зборніку лірычных імпрэсій «Абразкі».

Але асабовымі настроямі не абмежавалася лірыка Бядулі. Неабходна адзначыць і высокае майстэрства яго пейзажных вершаў. Яркімі фарбамі, смелымі вобразамі малюе ён родную беларускую прыроду.

> На раніцу з неба пакралі ўсе зоркі
> І ноч пабляднела ў цішыні.
> Пад грэбляю кончылі жабы гаворкі,
> Шпакі не крычалі над млынам.
> Згубіла зарніца чырвоную хустку
> На начным вясёлым гулянні.
> Паветра было так пахуча і густа,
> Расу вышывала паляна.

Другі струмень, які таксама вельмі моцна пачынае гучаць у творчасці Бядулі, гэта рэалістычны струмень, які праяўляецца і ў лірыцы і ў празаічных творах пісьменніка. У такіх вершах, як «Ці хто забывае цябе, небарака?», «Успаміны», «Тры малыя бярозкі—бярозавы снег», «Пастушка», паказваў паэт рэальныя факты пакутнага жыцця беларускага народа. Асабліва разгортваецца гэта тэма ў шматлікіх навелах, якія пачалі друкавацца ў «Нашай Ніве», а пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі былі сабраны і выданы зборнікам «На зачараваных гонях». Дэмакратычнасць творчасці Бядулі, яго шчыльная сувязь з народам, глыбокае і шчырае спачуванне народным пакутам, боль за яго цемру і бескультур'е пранізваюць гэтыя апавяданні.

З. Бядуля паказвае няшчасных, забітых, пакрыўджаных людзей, якія біліся, як рыба аб лёд, і ўсё сваё жыццё не бачылі нічога светлага, радаснага. Ён паказвае страшную галечу на вёсцы, голад.

Выдатная навела Бядулі «Пяць лыжак заціркі» напісана пісьменнікам з мяккім, але сумным гумарам, з вялікай стрыманасцю, якая стварае асаблівую выразнасць твора. Асабліва хвалюе пісьменніка лёс тых, хто больш за другіх слабы і бездапаможны, каго воўчыя законы капіталізма выкідваюць на вуліцу, на голад і смерць. У апавяданні «Умарыўся» паказаў Бядуля старога, які сваю гаспадарку падзяліў паміж сынамі і, тым самым, згубіў і чалавечую годнасць і спакой. Яго ўжо называюць дармаедам, крыўдзяць настолькі, што ён пакідае сям'ю і ідзе вандраваць. Лёс старыкоў, цяжка працаваўшых усё сваё жыццё і на старасці застаўшыхся ў галечы і пакутах, малюе пісьменнік і ў такіх апавяданнях, як «Туга старога Міхайлы», «Летапісец», «Вялікі пост», «На каляды к сыну». Лёс дзяцей, якія змалку цяжка працуюць, не ведаючы дзяцінства, не бачачы радасці, адлюстраваў пісьменнік у апавяданнях «Тулягі», «Малыя дрывасекі», «Велікодныя яйкі», «Смерць пастушка». Вялікая жаласць гучыць тут, боль за народ, за яго цемру, адсталасць, забабоны («Гора ўдавы Сымоніхі», «Чараўнік», «Сон Анупрэя»). Пісьменнік не толькі імкнецца паказаць жыццё блізкіх яму людзей, сярод якіх ён узрос і пакуты якіх яму добра вядомы. Ён імкнецца і філасофска асэнсаваць жыццё, зразумець, што-ж будзе далей, калі прыдзе светлы час для шматпакутнага народа. Погляды пісьменніка на гэта раскрываюцца ў яго алегарычнай казцы «Праўда і сіла». Ён кажа, што ўсё няшчасце ёсць вынік таго, што ў свеце сіла і праўда існуюць паасобна. Сіла робіць крыўду слабым людзям, нясе гвалт і руйнаванне. Праўда-ж вельмі слабая, каб адстаяць сябе і чалавецтва. Але прыдзе час, калі разам злучацца сіла і праўда, і тады загіне гора на зямлі. Паэт шле праклёны тым, хто выклікаў зверскую бойню, абураецца зверствам людзей, з жахам гаворыць аб руйнаванні жыцця, аб кровепраліцці. Паэт часта выражаў свае адмоўныя адносіны да вайны, свае настроі разгубленасці і жаху праз сімвалічныя вобразы («Юда жэніцца», «Кат», «На біблейны лад», «Рассеяўся туман», празаічная імпрэсія «Акорды мора»).

> Рассеяўся туман. Вы бачыце?—тож звер.
> Бо што было даўней, таксама ёсць цяпер,
> Во змеем з сваёй скуры выпаўз новы век...
> Вось—разгаданы сфінкс... Вось—божы чалавек.

І зусім зразумела, чаму з такой радасцю сустрэў Бядуля Лютаўскую рэвалюцыю. Ніспрынуцце нянавіснага самаўладства выклікала вялікі ўздым паэта. У вершах «Воля», «Нас пакута гартавала» гучыць вялікі ўздым паэта, вера ў лепшую будучыню. Аднак, сутнасць Кастрычніцкай рэвалюцыі не адразу здолелі зразумець пісьменнікі-нашаніўцы. Знаходзячыся ў апошнія часы пад нацыяналістычнымі ўплывамі беларускіх буржуазных колаў, якія ў часы Кастрычніка варожа выступілі супроць савецкай улады, беларускія песняры не адразу зразумелі, куды і з кім яны павінны пайсці. Аднак, пасля некаторых хістанняў, беларускія пісьменнікі-дэмакраты адшукалі адзіны, правільны шлях, шлях з усім працоўным народам к соцыялізму, к комунізму.

Так пачынаецца другі перыяд уздыму ў творчасці Бядулі. Калі першы ўздым быў звязан з нацыянальна-вызваленчым рухам, дык другі ўжо адносіцца да таго часу, калі Бядуля—савецкі пісьменнік пачынае прымаць актыўны ўдзел у стварэнні беларускай соцыялістычнай па зместу і нацыянальнай па форме культуры.

Новыя тэмы, бадзёры настрой, радасны ўздым пачынаюць гучаць у лірыцы Бядулі. З радасным пачуццём малюе ён прыроду, якая абнаўляецца пад ласкавым, залатым сонцам вясны. З прыродай, якая абнаўляецца вясной, параўноўвае паэт і жыццё савецкага народа, вызваліўшагася ад кайданаў, ад няволі. Паэт ужо не пытае, як раней, «куды ісці?» Перад ім расчыніліся шырокія краявіды, ён адчувае моц, ён адчувае патрэбу служыць народу, ісці разам з ім і змагацца супроць яго ворагаў. У вершы «Шляхі», выкарыстоўваючы свае старыя сімвалы-вобразы лесуноў і русалак у якасці алегорый старых, мінулых настрояў, з гордасцю гаворыць паэт, што яму ўдалося знайсці правільны шлях пасля доўгіх шуканняў і хістанняў.

> Доўга брыў таемным шляхам,
> Доўга брыў паўночным страхам,
> Доўга брыў пад хвойным дахам,
> Брыў уніз з гары,
> Раніў грудзі да крыві я,
> Былі спежкі там крывыя,
> Цёмныя і векавыя, —
> Так аж да зары.

Ужо ў іншых рысах малюе паэт сваю родную краіну—Беларусь, адзначаючы яе росквіт, выдатныя шляхі яе развіцця, папярэджваючы ворагаў, што ўсе сыны шчаслівай краіны адчуваюць сябе чырвонаармейцамі, абаронцамі радзімы («Беларусь»). У вершах з'яўляюцца новыя, бадзёрыя рытмы, паэтычны ўздым («Маладой гвардыі», «Чырвонаармейская»).

У 1922 годзе выходзіць зборнік апавяданняў Бядулі «На зачараваных гонях», у якім сабраны і ранейшыя яго празаічныя творы і тыя навелы, якія былі ўжо створаны пасля рэвалюцыі. Калі параўноўваць рэалізм Бядулі дарэвалюцыйных часоў з рэалізмам апошніх твораў, дык відавочнай з'яўляецца новая якасць яго рэалізма. Раней, малюючы жыццё вёскі, яе побыт, нястачу і галечу, пісьменнік усё-ж паказваў сялян пакорнымі, ціхімі людзьмі, якія ўсё сваё жыццё пакутуюць, але не думаюць нават аб змяненні жыцця. У апавяданнях «Дванаццацігоднікі», «Панскі дух», «На балоце» перад намі ўстаюць ужо энергічныя людзі, якія змагаюцца супроць сваіх прыгнятальнікаў, якія знішчаюць сваіх ворагаў, ненавісных паноў. Паказ новых людзей, здольных смела выступіць супроць ворагаў,—тое новае, што з'явілася ў творах Бядулі,—абумовіў і стварэнне пісьменнікам яго лепшага твора, аповесці «Салавей». У гэтай аповесці сканцэнтрыраваліся лепшыя дасягненні творчай дзейнасці пісьменніка.

Першая тэма ў аповесці—лёс таленавітага чалавека-мастака ў паднявольныя часы прыгону. Гэта тэма ўвесь час хвалявала аўтара. І ў раннім апавяданні «Велікодныя яйкі», і ў пазнейшым «Бондары», і ў «Трох пальцах» пісьменнік паказваў трагічны лёс таленту ва ўмовах прыгнёту, паказваў, з якой пагардай і недавер'ем адносіліся да такіх мастакоў. Бядуля любіў выводзіць своеасаблівых людзей, выключных па сваіх мастацкіх якасцях. Крыху рамантызіруючы сваіх герояў, ён тым не менш паказваў тыповасць іх становішча, іх трагічнага канца. У аповесці «Салавей» тэма гэта ўстае на ўвесь рост. Эстэтычныя погляды аўтара злучаюцца тут з апавяданнем аб цяжкім становішчы мастака. Сымон — Салавей, выдатны майстар сваёй справы, павінен забаўляць сытых, самазадаволеных, разбэшчаных паноў. Ён—прыгонны, ён павінен ім падначальвацца. Мастацтва Салаўя, Антона Мурашкі, дэкаратара—гэта мастацтва, якое цесна звязана з жыццём, выхавана соцыяльным асяроддзем. Пездарма паны з пагардай называюць гэта мастацтва «хлопскім».

З першай тэмай аб мастацтве народа і мастацтве паразітарных класаў, з тэмай аб лёсе мастака ў часы прыгону цесна пераплятаецца і другая тэма, гэткая-ж важная,—тэма аб цяжкім жыцці працоўных у часы паншчыны, тэма аб трагічным каханні двух прыгонных, Зосі і Сымона. І хоць сам пісьменнік не пускаецца ў разважанні аб панах і прыгоне, тым не менш кожная старонка аповесці — абвінаваўчы акт старым, мінулым часам. Пісьменніку ўдалося яскрава паказаць соцыяльную паразітарнасць паноў, іх разбэшчаную філасофію, якая ўжо сведчыць аб упадку, аб разлажэнні гэтай соцыяльнай групы.

Рамантычнасць фігуры Салаўя напамінае нам аб рамантычным нахіле творчасці Бядулі, але тут, зноў-такі, ужо іншая якасць рамантызма. Не ўцяканне ў свет казачных вымыслаў характарызуе рамантычнасць. Тут гучыць рамантыка жыццёвая, якая злучаецца з рамантыкай змагання, барацьбы, помсты.

Твор «Салавей» яшчэ больш узняў вядомасць і аўтарытэт Бядулі.

Творчая дзейнасць Бядулі з кожным днём усё больш узмацняецца; пашыраецца творчы дыяпазон пісьменніка. Тэмы з жыцця каўказскіх горцаў, прыгожай прыроды Каўказа распрацоўваюцца ім у зборніку вершаў «Каўказ», у зборніку празаічных апавяданняў «Танзілія». Вялікія зрухі на вёсцы, вызваленне сялянскай жанчыны ад гнёту, яе рост і актывізацыю, рост новага савецкага чалавека, барацьбу за новае жыццё, за соцыялістычную культуру паказаў пісьменнік у зборніках апавяданняў «Дэлегатка», «Незвычайная гісторыя». Праўда, не ўвесь час роўным быў шлях развіцця пісьменніка. Уплыў буржуазнага літаратурнага аб'яднання «Узвышша» адчуваўся некаторы час на яго творчасці. Але жыццё паказала пісьменніку сапраўдны твар «Узвышша», раскрыла яму вочы на агідную дзейнасць нацдэмаў і іх класавай базы—кулацтва.

Апошнія творы Бядулі: «Набліжэнне» і, асабліва, «У дрымучых лясах», побач са значнай колькасцю новых апавяданняў, мелі вялікі поспех у чытача.

У рамане «Набліжэнне» пісьменнік паказаў выключныя па сваёй якасці эпізоды з жыцця яўрэйскага мястэчка ў часы імперыялістычнай вайны. Трагедыя аслепшага на вайне Антона, маладой Ганулькі, якая засталася адна з маленькім дзіцем на руках пасля гібелі мужа на фронце, смерць маладой дзяўчыны Франкі ад бомбы, скінутай з варожага самалёта, яўрэйскія пагромы ў мястэчку, цынічная спекуляцыя, выкарыстанне народнага гора ў мэтах узбагачэння,—усё гэта стварае праўдзівае, хвалюючае палатно тагочаснага жыцця. Яшчэ далей паглыбіўся ў свае ўспаміны Бядуля ў рамане «У дрымучых лясах». Твор напісан у форме мемуараў, успамінаў маленства і юнацтва. Жыццё беднага яўрэйскага мястэчка, пакуты працоўных, галодных, няшчасных, пакрыўджаных,—вось першыя яго ўражанні. Здзекі ўрадніка над няшчаснай Мартай, якая, каб зарабіць рубель і накарміць галодных дзяцей, праходзіць босымі нагамі па распаленых цэглах, вясковыя забабоны, дарэмныя пошукі заработку бацькам пісьменніка, апавяданні старых дзядоў аб паншчыне і паводзіны паноў у адносінах да сялян на вачах хлопчыка,—усё гэта як-бы ўваскрашае мінулае.

Наша савецкая моладзь, перад якой расчынены ўсе шляхі і дарогі, не ведае ні хедэраў, ні ешыботаў, ні сінагогі, не ведае ні паноў, ні ўраднікаў. І Бядуля дзеліцца тут сваімі ўспамінамі, каб паказаць нашай моладзі, як цяжка было жыць і расці, як цяжка было шукаць сабе шлях у тыя змрочныя часы. Нам робіцца пасля чытання твора шмат больш блізкім і зразумелым лірычны герой ранніх вершаў Бядулі, які так моцна рваўся ў іншы, прыгожы свет, які, не ведаючы шляхоў, ствараў сабе рамантычныя мары, але ніколі не парываў з жыццём, з народам, бо вырас тут, сярод народных пакут і гора, бо быў плоццю ад яго плоці, крывёй ад яго крыві.

Вялікі і слаўны шлях творчай дзейнасці прайшоў Змітрок Бядуля (Ясакар). Яго выдатныя заслугі ў галіне развіцця беларускай культуры і літаратуры былі высока ацэнены партыяй і Урадам. Адзін з старэйшых заснавальнікаў беларускай сучаснай літаратуры, Змітрок Бядуля быў узнагароджан ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Вітаючы Змітрака Бядулю ў дзень 30-гадовага юбілея яго творчай дзейнасці, савецкая грамадскасць спадзяецца, што яшчэ шмат каштоўнага і выдатнага створыць ён на карысць соцыялістычнай культуры.

Змітрок Бядуля ў сваёй бібліятэцы.
Фота І. Каплінскага.

ЗМІТРАКУ БЯДУЛЮ

Мастакі разам з усім беларускім народам адзначаюць сёння 30-годдзе актыўнай і плодатворнай дзейнасці пісьменніка і драматурга-ордэнаносца Змітрака Бядулі.

Для нас імя Бядулі, гэта імя аднаго з тых скромных людзей, хто ў цяжкіх умовах царызма ўпарта і настойліва змагаўся за стварэнне беларускай літаратуры, а ў годы пасля перамогі Вялікага Кастрычніка мастацкім словам дапамагаў справе будаўніцтва бяскласавага соцыялістычнага грамадства. Бядуля — адзін з лепшых прадстаўнікоў савецкай інтэлігенцыі.

Нідзе, ні ў адной краіне народ не любіць так работнікаў літаратуры, мастацтва і навукі, як у краіне соцыялізма. І пісьменнікі, якія па вызначэнню вялікага Сталіна з'яўляюцца «інжынерамі чалавечых душ», верна служаць справе комуністычнага выхавання мас. Змітрок Бядуля з'яўляецца ўзорам шчырага служэння гэтай благароднай мэце, — яго творы прасякнуты асноўнай мысляю: дапамагчы партыі і ўраду ў перамаганні перажыткаў капіталізма ў свядомасці людзей, развіваць патрыятычныя пачуцці і глыбокую адданасць вялікай справе Леніна—Сталіна.

Мы ўпэўнены, што Змітрок Бядуля яшчэ доўгія годы будзе шмат і сур'ёзна працаваць над стварэннем новых высокамастацкіх, насычаных пафасам перамог соцыялізма твораў, якія будуць служыць справе далейшага пабеднага руху наперад к комунізму!

Заслужаныя дзеячы мастацтваў, мастакі-ордэнаносцы: **З. Азгур, В. Волкаў, А. Грубэ, М. Керзін;** заслужаныя дзеячы мастацтваў: **А. Бразэр, А. Бембель;** мастакі-ордэнаносцы: **В. Алтуф'еў, Е. Зайцаў, Л. Кроль, М. Манасзон, Н. Пашкевіч;** мастакі: **І. Ахрэмчык, Г. Віэр, Н. Гусэў, П. Гаўрыленка, Д. Генін, А. Глебаў, Г. Данальская, Н. Дучыц, І. Давідовіч, Г. Ізэргіна, А. Жораў, Ц. Ніпніс, В. Кудрэвіч, Е. Красоўскі, Л. Лейтман, О. Марыкс, Б. Малкін, А. Орлоў, В. Станкевіч, Е. Ціхановіч, Н. Тарасікаў, В. Хрусталёў, А. Шэўчэнка;** старшыня Саюза савецкіх мастакоў БССР — ордэнаносец **І. Рубінштэйн.**

Віт. ВОЛЬСКІ

ПРОЗА БЯДУЛІ

Пасля Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі З. Бядуля працуе амаль выключна ў галіне мастацкай прозы. У годы грамадзянскай вайны ён стварае апавяданні, прысвечаныя барацьбе беларускага народа супроць белапольскіх акупантаў. Апавяданні Бядулі кароткія, лаканічныя. Для іх характэрны яркі і цэльны сюжэт, напружанасць дзеі.

Геральныя вобразы беларускіх партызанаў і байцоў Чырвонай Арміі, маляўнічыя карціны беларускай прыроды з яе непраходнымі пушчамі, узгоркамі і квітнеючымі далінамі ўстаюць са старонак празаічных твораў Бядулі.

У 1927 годзе Бядуля напісаў аповесць «Салавей».

У гэтай аповесці пісьменнік раскрывае малавядомыя старонкі гістарычнага мінулага беларускага народа. Ён паказвае пакуты сялян пад прыгнётам паноў, барацьбу народа супроць сваіх прыгнятальнікаў. Ён уваскрашае вобразы перадавых, смелых і таленавітых прадстаўнікоў народнай масы. У аповесці паказана і доля сялянскіх дзяўчат, гвалтоўна адарваных ад родных хат, ад свайго асяроддзя,ператвораных у акторак прыгоннага тэатра, навучаных класічнаму балету і прымушаных лепшыя годы свайго юнага жыцця марнаваць у панскай няволі. Вобразы аповесці тыповы і характэрны для свайго часу і асяроддзя. У цэнтры аповесці Сымон Салавей — вобраз вялікай мастацкай сілы і абагульнення. Салавей — глыбока паэтычная, але адначасова мужная і смелая натура, вясковы талент-самародак, усёй істотай сваёй неадрыўна звязаны з народам.

«Цяга да гукаў запанавала ім, — піша ў сваёй аповесці Бядуля. — Часамі сядзіць ён у полі, на пні і пазірае ўдаль. Глядзіць і не бачыць, што зараніца палыхае ў нябесным бяскраі, пераліваецца ў розныя колеры. На кустах блішчыць шкляным шротам раса. Ён прыслухоўваецца да галасоў зямлі, — да яе тонкаструнных гусляў». Так фарміраваўся мастацкі талент Салаўя. Ён выступае перад сялянамі спачатку як мастак, як музыкант, а потым, у цяжкія хвіліны, з яго вырастае смелы, адданы і мужны змагар за справу народа, арганізатар і кіраўнік сялянскага паўстання.

У аповесці «Салавей», як і ў вершах, навелах і апавяданнях Бядулі, адчуваецца арганічная сувязь з фальклорам. У фальклоры, у жыцці народных мас знаходзіць пісьменнік вобразы людзей накшталт Салаўя — незвычайных, смелых, прывабных і таленавітых. І вобраз самога Салаўя і асобныя эпізоды аповесці арганічна звязаны з адпаведнымі матывамі вуснай народнай творчасці.

Сюжэт гэтага твора, прысвечаны лёсу таленавітага народнага самародка ў эпоху прыгону, быў выкарыстан у далейшым для стварэння аднайменнай п'есы і для балета, які быў паказан маскоўскаму гледачу на дэкадзе беларускага мастацтва, а таксама для кінофільма.

Аповесць «Салавей», якая вытрымала 14 выданняў і была перакладзена на шматлікія мовы, карыстаецца ў савецкіх чытачоў заслужаным поспехам.

У двухтомным рамане «Язэп Крушынскі», які быў напісан следам за «Салаўём», Бядуля стварыў вобраз кулака. Твор гэты, першы том якога напісан у 1928 годзе, быў накіраван супроць ідэолагаў кулацтва.

Карыстаючыся часта прыёмамі шаржу, пісьменнік спрабуе ў другім томе гэтага твора раскрыць сутнасць прадстаўнікоў нацыяналістычнай контррэволюцыі.

Паслякастрычніцкая творчасць Бядулі вельмі плённая. Творы яго шматлікі і разнастайны.

За апошнія годы пісьменнік апублікаваў аўтабіяграфічную аповесць «Набліжэнне». У гэтым творы праўдзіва апавядаецца пра пошукі і лёс інтэлігента-рамантыка ў невялікім яўрэйскім мястэчку Беларусі ў часы імперыялістычнай вайны 1914—18 год.

Паводле замыслаў пісьменніка, аповесць гэта з'яўляецца другой часткай вялікай аўтабіяграфічнай трылогіі, якая павінна ахапіць канец мінулага стагоддзя і першыя дваццаць год сучаснага.

У мінулым годзе выйшла ў свет першая частка гэтай трылогіі — аўтабіяграфічная аповесць «У дрымучых лясах», прысвечаная маленству пісьменніка. Чытаючы аповесць, мы часта сустракаем на яе старонках знаёмыя персанажы. Яны вядомы нам па іншых творах пісьменніка. Ёсць тут і чорнабароды Язэп з «Салаўя» і пані, што так моцна любіць катоў. Пазнаём мы і бондара Данілу з апавядання «Бондар» і шмат іншых людзей працы, якіх ведаў пісьменнік з маленства і якія паслужылі яму правобразамі для разнастайных твораў.

«Ён таропіў мройныя чорныя вочы праз вакно ў лес і іграў сумна-сумна», — піша Бядуля пра свайго бацьку, жыўшага ў мястэчку Пасадзец, і ў памяці нашай адразу ўсплываюць знаёмыя радкі аднаго з вершаў пісьменніка, напісаных у 1912 годзе:

> Вячэрнія гаснуць зарніцы
> Палоскаю бледнай над лесам.
> Мой бацька іграе на скрыпцы
> Хасідскую сумную песню.

Асобныя раздзелы аповесці набываюць характар самастойных навел, нібы не маючых непасрэднага дачынення да лёсу героя, але звязаных паміж сабою моцнай унутранай сувяззю. Увага пісьменніка сканцэнтравана ў гэтым творы не столькі на суб'ектыўных перажываннях героя, колькі на вобразнай характарыстыцы прадстаўнікоў таго асяроддзя, якое яго акружае. Жыццё свайго роднага мястэчка Пасадзец пісьменнік малюе шматбакова і ярка, у яго найбольш характэрных і тыповых праявах. Адначасова з гэтым аўтар удала і тонка перадае асаблівасці дзіцячай псіхікі, дзіцячага ўспрымання навакольнага свету. Асобныя эпізоды аповесці пісьменнік малюе з пункту погляду разумення хлапчука. Так, напрыклад, характарызуючы каваля Гіршу-Меера, вядомага на ўсю ваколіцу асілка, Бядуля піша: «Аднак Гірша-Меер мне не зусім падабаецца. Гэта з таго часу, калі я ў яго кузні наступіў нагой на гарачы кавалак жалеза...»

Перад чытачом у яркіх, жыццёвых эпізодах праходзяць дзіцячыя годы пісьменніка.

Вялікае гісторыка-пазнавальнае значэнне аповесці бясспрэчна.

Апошнія часы пісьменнік шмат працуе ў галіне літаратуры для дзяцей. Нядаўна ім закончана вялікая казка «Сярэбраная табакерка», якая заключае ў сабе рад паасобных казак, аб'яднаных вакол аднаго агульнага героя.

«Сярэбраная табакерка» напісана жывой і сакавітай народнай мовай. У ёй шмат гумару, шмат яркіх казачных вобразаў і сітуацый.

Выдатным творчым дасягненнем пісьменніка трэба лічыць і яго цудоўныя пераклады твораў Шолам-Алэйхема з яўрэйскай мовы на беларускую. Пераклады гэтыя вельмі блізкі к арыгіналу. Яны ўдала перадаюць беларускаму чытачу ўсе арганічныя асаблівасці твораў вялікага класіка яўрэйскай літаратуры.

М. СМОЛКІН.

МАТЫВЫ ЛІРЫКІ З. БЯДУЛІ

1.

Многія пісьменнікі пачынаюць сваю творчую біяграфію з вершаў толькі для таго, каб затым, спаліўшы «грахі маладосці», пісаць выключна ў прозе.

З. Бядуля —паэт і празаік — таксама пачаў з вершаў, але для яго паэзія ніколі не іграла службовай ролі і Бядуля застаўся на ўсё жыццё паэтам і прытым паэтам пераважна лірычным.

Крытыкі любілі гаварыць аб імпрэсіянізме ў творчасці Бядулі, не даючы сабе клопату ўдумацца глыбей у асаблівасці яго даравання і падводзячы пад гатовае азначэнне тое, што трэба было яшчэ аналізіраваць.

Калі пад імпрэсіянізмам разумець адмаўленне ад адлюстравання рэальнага жыцця і соцыяльнай праблематыкі, суб'ектыўна-ідэалістычныя адносіны да рэчаіснасці, пасіўную сузіральнасць,—а іменна гэтым характарызавалася школа імпрэсіяністаў у момант, калі ў літаратуру прышоў Бядуля, — то стане ясна, што гэты тэрмін не адпавядае зместу творчасці Бядулі нават у самым пачатковым перыядзе.

Нават калі ўзяць вядомы верш у прозе «Пяюць начлежнікі», які звычайна называлі «лірычнай імпрэсіяй» і прыводзілі ў доказ «імпрэсіянізма» Бядулі, то і тут перад намі не беспрадметная фіксацыя пачуцця паэта ў нейкі невыразны момант, а даволі акрэсленая ў сваёй настраёвасці і мэтанакіраванасці лірыка. Чуткае вуха паэта ўлоўлівае не толькі «маркотную песню» начлежнікаў, але і матывы яе:

> «Гэта стогн загнанага жыцця, жальба крывавай працы, споведзь доўгай нядолі, каханне веры пад ударамі цяжкай крыўды».

Ясна, што гаварыць аб імпрэсіянізме, як літаратурным стылі Бядулі, няправільна, але тое, што іменна гэты тэрмін быў ходкім у вызначэнні ранняга этапу творчасці Бядулі, мае поўную законамернасць. Сапраўды, большасць вершаў паэта, у тым ліку і вершаў у прозе («Пяюць начлежнікі», «Мініятуры», «Купальская ноч»), характэрны адсутнасцю сюжэтнай пабудовы і ўласцівай сюжэтным вершам апавядальнай інтанацыі. Па сваёй кампазіцыі — гэта вершы-мініятуры, вершы настрою з характэрнай інтанацыяй, самастойнасцю слова і экспрэсіўнасцю.

Гэта і давала падставу залічыць паэта ў лік імпрэсіяністаў. Але па такой адзнацы можна ўсіх лірыкаў абвясціць належачымі да гэтай школы.

Бядуля лірык па самой сутнасці свайго светаадчування. Звычайна яму вельмі цяжка дасягнуць аб'ектывізацыі пачуцця, бо свет рэальных рэчаў і людзей ён успрымае глыбока асабіста і выражае гэта адчуванне ў вобразнай цэласнасці.

Да такога дасканалага ў кампазіцыйных і сюжэтных адносінах твора, як «Салавей», Бядуля прышоў, з аднаго боку, праз свае кароткія соцыяльна-бытавыя навелы і, з другога, — праз сюжэтныя паэмы «У ясных крушнях», «Адплата пану» і інш., якія цікавілі паэта ў першую чаргу фабульным развіццём, неабходнасцю сказавай пабудовы, якая спатрэбілася яму ў будучай рабоце. Не гледзячы на наяўнасць рыфмы паэмы гэтыя з'яўляюцца ў большай меры празаічнымі творамі, чым некаторыя апавяданні і навелы Бядулі.

2.

Так здарылася, што перш чым пазнаёміцца з Пушкіным, З. Бядуля прачытаў біблію і легенду аб прароку, ратуючым свой народ мудрым і гнеўным словам.

Тады яшчэ ён успрыняў легенду не ў яе трагічным варыянце.

Талмуд, які прыходзілася Бядулю вывучаць, не мог быць яму блізкім з-за яго мёртвай, схаластычнай філасофіі. Бядуля ўжо тады быў паэтам і яго глыбокая лірычная натура захаплялася квяцістымі, расквечанымі пышным усходнім арнаментам казаннямі, якія ён чэрпаў з бібліі. Біблія засланяла жыццё. Так з'явілася першая кніжачка вершаў-варыяцый на біблейскія матывы, аб якой мы даведваемся з аўтабіяграфічнай аповесці «У дрымучых лясах». «Мірыям» называлася яна. Аб каханні, якое вышэй за жыццё, спяваў паэт. Усходнія паэтычныя легенды, якім следаваў малады паэт, абумовілі павышаную эмацыянальнасць, метафарычную раскошнасць стылю гэтых вершаў. Усё тут было нетутэйшым. Юнак-паэт страціў адчуванне часу. Жыццё на хвіліну здавалася ідылічным, узнікаў традыцыйны вобраз пастаральнага пастушка, іграючага на жалейцы:

> «Над полем стаіць белы туман, як малако туман. Ля рэчкі пасуцца цяляты. Пастушок грае на жалейцы, а я сяджу на камені ды спяваю. І кожнае слова маёй песні хвала красе тваёй.
> Мірыям... Мірыям...»

Гэты верш — свайго роду спроба схавацца ад суровых супярэчнасцей у свет прыгожых бясплотных вобразаў. Але ад жыцця нікуды не схаваешся. Сын народа Бядуля не мог жыць іншым жыццём, чым народ.

А жыццё гэта было цяжкім і суровым і патрабавала актыўнага супроцьдзеяння. І асноўным паэтычным матывам ранняй лірыкі Бядулі з'яўляецца матыў неўпарадкаванасці жыцця, адзіноцтва чалавека, прыдаўленага гэтым жыццём. З'яўляецца вобраз мяцеліцы-завірухі, як фона і лірычнага выражэння супярэчнасцей жыцця:

> Я пайшоў у сыр-бор
> Гаіць раны душы
> Пад мяцеліцай зор,
> Пад віхурай цішы.
> («Я пайшоў у сыр-бор», 191

Гэта не «дробнабуржуазная [illegible] «упадніцтва», як любілі тлума[illegible] тыкі, а настрой, абумоўлены [illegible] цыяльнымі абставінамі.

Асобныя раннія вершы [illegible] саны ў кальцоўска-некрасаў[illegible] («Хоць ты разарвіся», «Ці х[illegible]

ПЕРАЧЫТВАЮЧЫ „САЛАЎЯ“

★

Н. Левін

★

У дні юбілея Змітрака Бядулі, калі мы зноў і зноў звяртаемся да вобразаў яго творчасці, мы з асаблівай цеплынёй успамінаем адзін з лепшых твораў пісьменніка—яго аповесць з часоў паншчыны «Салавей».

Вобразы «Салаўя» даўно перасталі быць здабыткам толькі нашай літаратуры. Яны «перакачавалі» і вельмі добра ўжыліся, акліматызіраваліся і ў многіх галінах мастацтва: у музыцы, тэатры, кіно, балеце. У чым-жа прычына такой папулярнасці гэтага твора?

Прычына заключаецца не толькі ў выдатных мастацкіх асаблівасцях аповесці, хоць «Салавей» і з'яўляецца адной з лепшых кніг нашай белетрыстыкі.—Прычына гэтага заключаецца ў тым, што Змітрок Бядуля здолеў заглянуць у самую душу народа, раскрыць перад чытачом багацце духоўных сіл, якое тоіцца ў шырокіх масах працоўнага сялянства, паказаць вялікую перавагу этычных норм, якія склаліся і захоўваюцца ў глыбіні народа, над этыкай арыстакратыі, паноў Вашымірскіх.

Прычына папулярнасці, жывучасці вобразаў «Салаўя» заключаецца ў тым, што пісьменнік здолеў надзяліць герояў аповесці такімі рысамі, якія выяўляюць іх чалавечыя своеасаблівасці, што робіць гэту аповесць сапраўды нацыянальным творам.

Як вядома, зместам «Салаўя» ёсць апавяданне аб таленавітым сялянскім юнаку, які валодаў здольнасцю пераймаць гукі прыроды, за што багаты пан Вашымірскі надумаўся «далучыць» яго да сваёй калекцыі дзівосных рэчаў, каб выхваляцца ім перад гасцьмі. Сымон (так завуць героя аповесці) не захацеў стаць панскім «салаўём». Ён арганізаваў партызанскі атрад і стаў на чале яго, помсцячы панам за іх здзекі над народам.

Такім чынам, у аповесці паказаны два жыццёсклады: з аднаго боку—«чыстакроўны» арыстакрат Вашымірскі, яго сям'я валодаючая вялікімі багаццямі, з другога боку—сялянства, якое пакутуе пад прыгнётам паншчыны. Аднак, жыццё гэтых двух класаў паказана не толькі з боку рознасці ў іх матэрыяльнай забяспечанасці, а перш за ўсё ў плане рознасці іх духоўных культур.

Упершыню ў беларускай літаратуры пастаўлена ва ўсю шырыню пытанне аб узаемаадносінах двух культур, двух мастацтваў—народнага і таго, якое ствараюць «вышэйшыя» класы.

Пан Вашымірскі ў аповесці з'яўляецца прадстаўніком таго класа, які трымае ў сваіх руках не толькі большую частку народных багаццяў, але і карыстаецца ўсімі пладамі культуры, накопленай чалавецтвам. Ён мае магчымасць слухаць творы найвялікшых музыкантаў, набываць карціны выдатнейшых майстроў. Мноства рэчаў танчэйшай работы, надзвычай каштоўных і прыгожых, акружае яго. Усё гэта і ёсць тая культура, што перадавалася з пакалення ў пакаленне разам з рэліквіямі роду і якая так старанна ахоўвалася ад «чужых», ад «плебейскага духу».

Вялікая заслуга Змітрака Бядулі ў тым, што ён не акарыкатурыў Вашымірскага, яго сям'ю, яго асяроддзе. Але на многіх рысах, вельмі спіслых і трапных, ён здолеў узарваць іх вобразы знутры. Старая маці Вашымірскага любіць толькі катоў. Людзей яна не любіць, бо яны «недастойныя грэшныя стварэнні». Яна гатова засекчы каго-небудзь з людзей за тое, што не дагледзелі яе кошку. Садыст ксёндз Марцэвіч асабіста прысутнічае пры пакаранні жанчын бізунамі. Ва ўсім гэтым з найвялікшай яскравасцю адлюстроўваецца духоўная беднасць «шляхетных» паноў.

А навакол палацаў Вашымірскіх жыў у найвялікшай беднасці шматмільённы народ. Народ таксама тварыў. Нярэдка ён ствараў і зусім выдатныя перлы мастацтва, якія старанна ахоўваліся, перадаваліся з вуснаў у вусны і адшліфоўваліся на працягу стагоддзяў. З свайго асяроддзя народ вылучаў выдатнейшых мастакоў-самародкаў. Толькі самародкі з народа не мелі ніякага ўяўлення аб Бетховену ці Рэмбрандту, аб культурнай спадчыне. Вось чаму ў дэкаратара, мастака з прыгонных, антычныя калоны былі вельмі падобны да ствалоў бярозы, а аркадскія пастушкі нагадвалі тутэйшых. Музыканты з аркестра стваралі па гатовай канве нешта сваё ўласнае, што даставіляла нямала клопатаў педагогам-французам, запрошаным Вашымірскім для яго студыі. Паны не прызнавалі за народам права на творчасць. Пан Вашымірскі, які не быў пазбаўлен некаторай сантыментальнасці і які лічыў сябе «жрацом чыстага мастацтва», усё-ж думаў, што гэта самае «чыстае мастацтва» трэба ўнушаць халопам бізунамі.

Сапраўднае мастацтва павінна служыць народу; яно створана для народа, які здольны ўспрыняць усё яго хараство,—гэтая думка лейт-матывам праходзіць праз усю аповесць. Яна з'яўляецца асноўнай яе канцэпцыяй.

Калі Сымон стаў на чале партызанскага атрада яго салаўіны свіст служыў баявым сігналам для партызанаў. І «не раз у майскую ноч, калі яркі круглы месяц углядаўся ў казачна-прыгожыя панскія палацы, паны ўздрыгвалі ад страху, пачуўшы песню нават звычайнага салаўя ў густым пахучым парку...»

Стыль «Салаўя» радуе сваёй прастатой, празрыстасцю.

З вялікім майстэрствам рысуе Бядуля пачуцці і перажыванні сваіх герояў.

Глыбока пранікаючы ў пачуцці пакрыўджанай дзяўчыны, разгортвае пісьменнік перажыванні пакрыўджанай Зоські. Пералом у яе настроі, той прыліў унутраных сіл, больш інстынктыўных, чым разумова-асэнсаваных, якія яна адчула пад уражаннем часовай здрады Сымона, пераход ад абыякавасці да непакорнасці і, нарэшце, забойства ёю панскага гайдука.—аб усім гэтым расказана пераканаўча, майстэрска.

Нават у нязначных, на першы погляд, дробязях і дэталях Бядуля выступае праўдзівым, аб'ектыўным пісьменнікам, які не імкнецца навязаць чытачу свае тэндэнцыі, навучаць яго. Кожная праблема аповесці прыходзіць як лагічны вывад з усёй сумы вобразаў. Найбольш удалай атрымалася сярод усіх дзеючых асоб аповесці фігура Сымона—Салаўя. Ён дадзен у нямногіх, але шырокіх мазках.

Вобраз Сымона кампазіцыйна звязвае абодва полюсы аповесці—палац Вашымірскага і вёску. Разам з Салаўём дзея пераносіцца з палаца ў вёску і наадварот.

Поўнымі жыцця і вельмі каларытнымі атрымаліся вобразы іншых герояў аповесці—Вашымірскага, яго маці, Зоські.

«Салавей» не з'яўляецца поўнасцю рэалістычным творам. Элемент рэалізма і рамантыкі пераплятаюцца тут амаль на кожнай старонцы.

Сымон—Салавей таксама не ўспрымаецца чытачом як зусім рэалістычны вобраз. Сымон хутчэй апяваецца пісьменнікам, чым апісваецца ім. У Сымоне ўвасоблена не толькі рамантыка барацьбы, непакорнасць, гатоўнасць да самаахвяравання. У ім ёсць, калі так можна сказаць, рамантыка вялікіх пачуццяў, летуценнасці, здольнасць паддавацца эмацыянальным уражанням, якія ідуць ад мастацтва, ад прыроды, ад усяго прыгожага.

Тое-ж самае мы наглядаем у вобразе Зоські. У гэтым вобразе таксама многа рамантыкі, урачыстай прыўзнятасці.

Вялікае месца займае ў аповесці пейзаж, які амаль заўсёды падкрэслівае, адцяняе настрой і перажыванні герояў. Так, напрыклад, раздзел, у якім расказваецца аб сілах, абудзіўшыхся ў Зоські, аб тым, як яна забівае Макара, пачынаецца прыгожым малюнкам пацяплення сярод зімы:

«Снег таяў па-вясноваму, рыхлеў як кісель. Блішчэла ад сонца. Ад палазоў, ад конскіх капытоў заставалася на дарозе брудная вада.

У блізкім лесе агаліліся дрэвы, вызначыліся на белым фоне снягоў вільготнай чарнатою. З шэра-брудных саламяных стрэх вясковых хатак таксама сцякаў снег... Нейкая радасць панавала ўсюды, радасць, вырваная з вільготных усмешак зімовага сонца. Было фальшывае адчуванне набліжэння вясны, вясны ў часы каляд. Абманваў вока па-вясноваму пачарнеўшы лес...»

Усё гэта павінна больш адцяніць настрой Зоські. Такі прыём вельмі характэрны для рамантычнай плыні ў літаратуры.

Уся аповесць прасякнута паэтычнасцю беларускага пейзажа. У пейзажах Бядулі ёсць не толькі настрой,—у іх ёсць неабходная кожнаму пейзажу графічнасць, г. зн. тыя дробныя, канкрэтныя дэталі, якія адыгрываюць такую вялікую ролю ў стварэнні «пейзажнага» настрою. Вось прыклад:

«Снег быў яшчэ неглыбокі, але панскі парк пабялеў ужо. Лісце даўно абсыпалася з дрэў і праз сетку галін відаць была даль, яркая, сінеблакітная, нібы на паперы намаляваная.

Каменныя львы з гладкай плошчы тэрасы пагдядалі ў абснежаныя бязбрэжніцы мёртвымі задуменнымі вачыма».

Такая маленькая дэталь: «мёртвыя задуменныя вочы каменных львоў», а як многа яна дае ў стварэнні «жывога» ўяўлення, настрою неабсяжнай белай раўніны.

Аповесць Змітрака Бядулі «Салавей» дагэтуль з'яўляецца адным з лепшых твораў нашай літаратуры.

«Салавей» Змітрака Бядулі ў пастаноўцы Дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга беларускага драматычнага тэатра. У ролі Сымона—Салаўя засл. артыст БССР ордэнаносец Л. Рахленка. Фота І. Каплінскага.

Змітрок Бядуля

Жыві, Ксаверый!

Урывак з аповесці для дзяцей „Сярэбраная табакерка“

Аповесць напісана па матывах беларускай народнай казкі аб тым, як заяц схапіў смерць у табакерку і ўсе жывыя істоты на зямлі перасталі паміраць.

Адзін аптэкар прыдумаў сонны парашок на дзесяць год і парашок супроць сну.

У гэтым раздзеле апавядаецца, як хітры кардынал усыпіў каваля Ксаверыя.

Увечары, яшчэ да вячэры, унукі палезлі да дзеда на печ. Дзед у іх запытаўся:

— Дык вы хочаце, каб разбудзілі аптэкара Савіцкага?

— Хочам, і чым найхутчэй, тым лепш, — адказалі яны.

— Гэта праўда, — згадзіўся дзед. — Разбудзіць аптэкара Савіцкага было лёгка, але да яго дабрацца было цяжка, хаця ў цара скамарохаў у кішэні быў падрабязны план мясцовасці, дзе знаходзілася падзямелле, і поўнае апісанне самога падзямелля, у якім Савіцкі заснуў на сто год. Ехаць туды прыходзілася праз розныя краіны сушай, а пасля морам. Дзіда-дзед не меў ахвоты ехаць. Цар скамарохаў звярнуўся да яго:

— Вы, пане Заяц, павінны пабачыць свет, жывых істот якога вы сваёй табакеркай выратавалі ад смерці.

— Праўда, — сказаў дзіда-дзед. — Аба мне ва ўсім свеце варкатня штодня, а я і не чую.

Дзіда-дзед згадзіўся паехаць. Пакуль што яны рухаліся на сваіх трох фурманках і дзе-ні-дзе ставілі спектаклі. Ім за працу плацілі, галоўным чынам, добрым старасвецкім мёдам. Саўка і Юрка запэўнівалі, што кожны кілішак добрага мёду дае ім тры кілішкі таленту.

З іхняй думкай згадзіўся адзін з публікі, шчыры прыхільнік скамарохаў. Ён сказаў так:

— Каб я так меў зайцаву табакерку, як гэта праўда! Я сам па сабе маляр і добры мёд дае мне таксама натхненне. Некаторыя ў нас кажуць, што лепш мець мёду ў бочцы, чым смерць у табакерцы.

— Усё добра ўмеру, — сказаў дзіда-дзед.

***

Пра дзіда-дзедаву табакерку гаварылі ўсюды. Былі нават пушчаны такія прымаўкі:

— Каб свіння мела зайцаву табакерку, яна зноў пусціла-б смерць на волю.

— Каб на цябе зайцава табакерка адчынілася.

— Не зацягнеш мяне ў зайцаву табакерку.

Вандруючы па розных гарадах, яны заўважылі, што жанчыны носяць капялюшыкі-табакеркі, альбо шапачкі з зайцавымі вушамі. Таксама гузікі былі ў выглядзе табакерачак. Рэстараны і гасцініцы насілі назву «Табакерка».

Скамарохі ездзілі з горада ў горад і ставілі спектаклі. На прадмесці аднаго горада яны заўважылі вялікі натоўп. Яны зацікавіліся і спыніліся каля саракагадовай жанчыны з напалоханымі шэрымі вачыма, якая хуталася ў вялікую — з галавы да пят — хусціну з вытканымі зайчыкамі. Яна апавядала ім вось што:

— Увесь гэты люд збіраецца каля аднаго скамянелага чалавека, мае родныя. А той скамянелы чалавек, мае міленькія, мой муж, мой бедны Ксаверый...

Жанчына біла сябе кулакамі ў грудзі ды ўсхліпвала:

— Мой Ксаверый быў добрым мужам для мяне і добрым бацькам для нашых дзетак. Кавальскім малатком ён зарабляў чэсны хлеб для нашай сям'і. Хай будзе благаславёны пан Заяц, які трымае за пазухай табакерку, а табакерка трымае ў сваіх сценах смерць-паганіцу. Ксаверый быў слаўным кавалём, мае ягадкі. Працаваў у кузні ад рання да цямна. Ён да таго не любіў духоўнікаў за іх фальш, за іх хціўнасць, за іх драпежнасць, што заўсёды ў кузні высмейваў іх перад усім народам. Яны і такія, яны і сякія, — гаварыў Ксаверый. Калі мой муж што-небудзь рабіў у кузні для папа ці для манаха — тыя ніколі за работу не плацілі, мае залаценькія. А замест платы яны брахалі адно: «Дзякуем, бог заплоціць!» — «За дзякуй шапкі не купіш», — гаварыў ім Ксаверый. А бог плаціў заўсёды аднымі і тымі самымі манетамі — дзецьмі, якіх трэба карміць. Дзяцей у мяне, мае сэколікі, адзінаццаць штук з коптарам — адзін-у-адзін. Што мне з імі цяпер рабіць? Парайце, людцы добрыя!

Цяжарная жанчына заламала рукі і заплакала ўголас:

— Дык вось, месяц таму назад спыніўся ля кузні адзін доўганосы поп, каб яму гарачы вугаль у лоб! Перш-на-перш гэты доўганосы ў мяне есці папрасіў. Я паставіла яму міску капусты і булку хлеба. Ён вурчыць, як кот, і так жарэ, што аж цыбаты нос гнецца. Тым часам мой Ксаверый яму коней падкоўвае. Для чатырох коней шаснаццаць новых падкоў, на кожную падкову па восем ухналёў,—падлічыце, якая гэта капеечка! Кончыўшы працу, мой Ксаверый папрасіў плату. А доўганосы яму на гэта: «Бог заплоціць». Тады мой Ксаверый моцна на яго зазлаваўся і сказаў: «Плаці ты сам, доўганосы каршун! Смерць цяпер у зайцавай табакерцы і ніякія багі мне не патрэбны!» — «А я плаціць не буду», — сказаў доўганосы, каб на яго заяц табакерку адчыніў! Тады мой Ксаверый — цап яго абцугамі за вопратку. «Плаці, — кажа, — а то...»

Жанчына пры гэтым выцірае вочы, з якіх слёзы цякуць ручаінамі.

— У доўганосага вочы загрэліся, ён выхапіў з кішэні нейкую паперку, прыткнуў да носа майго Ксаверыя, і муж мой, прыпёрты да сцяны кузні, скамянеў з абцугамі ў руках. Людзі, быўшыя пры гэтым, крыкнулі ад страху і наўцёкі куды вочы глядзяць... Доўганосы каршун доўга смяяўся, узяў дошчачку, напісаў на ёй нешта да чырвані напаленым дротам і павесіў на грудзі майму Ксаверыю. Унь, мае людцы, ідзіце, паглядзіце! Скажыце беднай удаве, няўжо заяц выпусціў смерць з табакеркі? Мне так шкода маіх дзетак... Ёсць адзінаццаць, а будзе дванаццаты.

Жанчына горка зарыдала.

***

Скамарохі зразумелі, у чым справа, і пайшлі да кузні. Стаяў натоўп, які баяўся падыходзіць блізка да скамянелага каваля. Вочы каваля былі закрыты, але ва ўсёй постаці яго было відаць, што ён заснуў і скамянеў у часе найвялікшага гневу. У яго абцугах засталіся чорныя шматкі з вопраткі кардынала Баніфацыя.

Жонка Ксаверыя крыкнула да скамарохаў:

— Не падыходзьце блізка, мілыя людцы! Не падыходзьце. Каб вы не набраліся ад яго скамянеласці... О, памілуй нас заяц з табакеркай...

Скамарохі падышлі і прачыталі па дошчачцы, якая вісела на грудзях Ксаверыя:

«У імя святой тройцы я, Баніфацый першы, намеснік бога на зямлі, караю смерцю бязбожніка каваля Ксаверыя. Няхай ён так стаіць на вялікую ганьбу да тых пор, пакуль будзе стаяць сама зямля. Паведамляю, што табакерка са смерцю ў маіх руках. Хадзіце ў божыя храмы, маліцеся, шануйце духоўнікаў, тады смерць будзе спакойна сядзець у табакерцы. А калі не паслухаецеся, усе скамянееце. Аман».

[illegible] кінуў [illegible] тую [illegible] хату. Зазвіне[illegible] хам Люсенька, дзіда-дзед, а за імі [illegible].

Ксаверыха пакрыўдзілася і пачала іх шчыра папракаць:

— Хоць вы, паны скамарохі, з усяго на свеце смяецеся, але няма чаго шчэрыць зубы з гора беднай удавы, якая не мае хлеба для адзінаццаці сірацін. Выходзіць так, што вы каменне кідаеце ў маю жабрачую торбу, — і Ксаверыха так залілася слязьмі, што скамарохі перасталі смяяцца. Плач каваліхі ўздзейнічаў на іх мацней, чымся вёдры з халоднай вадой.

Тады цар скамарохаў звярнуўся да плачучай каваліхі з такімі сардэчнымі словамі:

— Шаноўная часовая ўдава, пані Ксаверыха! Няхай твае вечныя вочы пабачаць і вечныя вушы пачуюць, што скамарохі заўсёды прыносяць народу радасць. Прынясём поўныя жмені радасці і табе. Тады перастанеш быць удавой.

Ксаверыха зазлавалася:

— Як вы адважваецеся гаварыць мне пры маім дарагім нябожчыку такія непрыстойныя словы! Першы раз бачу, каб дурні кусаліся, як вужакі. Не абманвайце старую вераб'іху мякінай. Я ніколі не выйду замуж у другі раз! Не хачу мець яшчэ адзінаццаць дзяцей! Назаўсёды застануся шчырай удавой Ксаверыя. Кожны дзень я па тры разы буду сюды прыходзіць і прыносіць нябожчыку бульбяныя клёцкі з малаком. Ён іх вельмі любіў пры жыцці. А вы... А вы... ідзіце буслам сена касіць!

Ад гневу ў Ксаверыхі высахлі слёзы.

Цар скамарохаў адкінуў доўгі чуб з вачэй зграбным узмахам галавы і ўрачыста сказаў:

— Пані каваліха, высокашаноўная Ксаверыха! Вы хутка пабачыце ўласнымі вачыма, што скамарохі маюць найлепшыя на свеце сэрцы. Але пані ўдава сёння-ж перастане быць удавой.

— Не старайцеся перамудрыць маё ліха, — сказала Ксаверыха, апусцілася на калені і пачала так паўзці да скамянелага мужа і гаварыць:

— Клянуся святой табакеркай, што ніколі не здраджу табе, родны Ксаверый! Клянуся адважным зайцам, што ніколі не выйду замуж! Клянуся багам, які нашэптваў зайцу на вуха: «Пасадзі смерць у табакерку», што назаўсёды застануся тваёй чэснай удавой! О, Ксаверый... Ксаверый... Перастаў звінець музыкай твой малаток і перастаў карміць клёцкамі адзінаццаць сірацін. О, Ксаверый... Ксаверый... Патух агонь на тваім горне, не сыпяцца іскры ў тваёй кузні, не смяецца народ з тваіх вясёлых жартаў — і я плачу-плачу горкімі ўдовінымі слязьмі... О, Ксаверый, Ксаверый... Няхай душа твая пойдзе ў рай і ў божай кузні, адкуль бухаюць грымоты і бліскаюць маланкі, выкуе адзінаццаць малаткоў — сталёвых і гартаваных — і кіне з неба ўніз. Няхай нашы адзінаццаць сірацін ходзяць па зямлі ды б'юць па галовах усіх благіх людзей!

***

Цар скамарохаў загадаў прывезці сюды на фурманках вопратку і грым. Так было зроблена. Тут-жа паставілі палатку, у якую ўвайшлі ўсе скамарохі.

Хутка яны выйшлі ў белых мантыях, на якіх былі вышыты залатымі ніткамі табакеркі і зайчыкі. На галовах скамарохаў былі высокія шапачкі з зайцавымі вушамі з залатой паперы. Наперадзе ўсіх ішоў цар скамарохаў з лірай у руках. За ім ішлі ў рад усе скамарохі з рознымі музычнымі інструментамі. Яны ігралі вельмі прыгожа, набліжаючыся да скамянелага каваля, і спявалі ў такт музыцы песню з двух слоў:

«Жыві, Ксаверый! Жыві, Ксаверый! Жыві, Ксаверый!»

Народ змоўк. Змоўкла і Ксаверыха. Яна стаяла на каленях, і яе вочы былі зачараваныя гэтым відовішчам.

Цар скамарохаў падышоў блізка да скамянелага Ксаверыя, дастаў з-пад шырокай палы белай мантыі пазалочаную шкляную місачку і даў знак скамарохам.

Усе спыніліся. Змоўкла музыка. Цар скамарохаў перадаў ліру дзіда-дзеду, а сам пачаў кружыць місачку над галавой Ксаверыя і гаварыць:

— О, заяц над усімі зайцамі з табакеркай над усімі табакеркамі! Насып у гэту місачку па тры кроплі веснавога ветру з усіх вятроў свету! Налі ў гэту місачку па тры кроплі жывой вады з усіх рэчак, мораў і акіянаў! Насып у гэту місачку іскры з яснага сонца, з поўнага месяца, з дробных зорак і дай усё гэта панюхаць чэснаму кавалю Ксаверыю.

Цар скамарохаў паднёс місачку з парашком супроць сну пад самы нос Ксаверыя. Пры гэтым даў знак скамарохам і яны заспявалі хорам і зайгралі:

«Жыві, Ксаверый!.. Жыві, Ксаверый... Жыві, Ксаверый...»

***

Цела Ксаверыя налілося сокамі жыцця. Каваль уздрыгануўся, адкрыў вочы, пачаў чхаць, бо дзіда-дзед прымяшаў тытун да парашка. Ксаверый азірнуўся затуманенымі вачыма, схапіў абцугамі белую мантыю цара скамарохаў і крыкнуў:

— Плаці, доўганосы каршун, за шаснаццаць новых падкоў і за сто дваццаць восем ухналёў!

Цар скамарохаў, не звярнуўшы на гэта ўвагі, сказаў Ксаверысе:

— Уставай з кален, добрая жонка Ксаверыя! Ты ўжо не ўдава...

Ксаверыха ўзнялася на ногі, схапілася рукамі за абцугі і крыкнула радасным голасам:

— Ачухайся, Ксаверый! Гэта не доўганосы. Асцярожна! Парвеш белую кашулю [illegible] слаўнага і шаноўнага [illegible]

[illegible] Га? ! —з[illegible] каваль Ксаверый.

—Га? !

Ксаверыха вырвала ў яго абцугі, шпурнула на зямлю і кінулася мужу на шыю, ашчапіўшы яго рукамі мацней, чым жалезнымі абцугамі.

— О, мой Ксаверый! О, мой Ксаверый!—крычала яна непрытомным голасам.— Я згатую аж два саганы бульбяных клёцак з малаком! Я пазычу бочку піва ў добрага суседа! Я пашыю дзецям адзінаццаць новых зрэбных кашуль!

Ад здзіўленых і радасных крыкаў натоўпу шумела ў вушах.

Цар скамарохаў даў знак сваім. Скамарохі схапілі палатку ды на воз, самі ўсе ўскочылі на фурманкі і рушылі з усіх сіл —аж пыл задыміў на шырокім гасцінцы.

За скамарохамі гналіся дзесяткі людзей з крыкамі:

— Пачакайце, добрыя людзі! Напоім і накормім! Па-ча-кай-це!!

Наперадзе ўсіх беглі каваль і каваліха і літасці прасілі:

— Півам пачастуем! Клёцкамі! Блінамі! Дзеці нашы падзякуюць вам! Вашых коней падкуём! Новыя шыны на калёсы нацягну! Пачакайце! Мілыя! Родныя! Добрыя! Вясёлыя! Слаўныя! Пачакайце! Па-ча-кай-це!

Скамарохі падкідвалі ўгару свае шапкі ў знак развітання, а коні імчалі іх галопам. За фурманкамі беглі карова, сабака, ваўкі і адзіны леў.

Калі скамарохі схаваліся за гарою, да іх слуху яшчэ плылі з ветрам крыкі: «Пачакайце!»

Фурманкі павярнулі на лясную дарогу і ехалі доўгі час блытанымі сцежкамі, каб іх не знайшлі. Яны ўцякалі ад славы і пашаны, як ад ворагаў.

Так яны ехалі цэлы дзень. Калі сцямнела, яны спыніліся каля ўзгорка ля чыстай крыніцы. Мужчыны распрэглі коней, паставілі палатку, а жанчыны расклалі агонь і пачалі рыхтаваць вячэру.

цябе, небарака»). У іх паэт гаворыць ад імя абяздоленага люду.

Разам з гэтым з'яўляецца жаданне знайсці выхад, абнавіць жыццё, жаданне якое мела неакрэслены характар, [illegible] вельмі паказальна:

Хачу чагосьці новага —
Парву ланцуг, парву.

Узнікае рамантычная мара аб нейкай невядомай вольнай зямлі, якую падсказала паэту яго багатая фантазія.

Мы маем на ўвазе верш Бядулі «Ці ведаеш зямлю арлоў-людзей магутных» (1912), які прадстаўляе адзіны ў беларускай літаратуры своеасаблівы водгук на песню Міньоны Гётэ («Ты знаеш край?»):

Ці ведаеш зямлю арлоў-людзей магутных,
Ці ведаеш ты дні віхораў і агня?
Ці ведаеш ты сказ аб волатах пакутных?
Ці ведаеш ты спеў аб вечным ззянні дня?

Гэты верш пабудаван па формуле вялікага запытальнага перыяда, на які не наступае адказу. Гэта і зразумела чаму: такой «абетаванай» зямлі не было, шляхі да яе трэба было шукаць.

Тое, што ад жыцця нельга дэзертыраваць, было для паэта ясна. Аб гэтым сведчыў паэтычны вопыт Пушкіна і Лермантава, Гогаля і Некрасава. Але мучыцельна ўстала другое пытанне: роля і месца паэта ў жыцці. Гэта пытанне немінуча ўстае перад кожным паэтам, для якога паэзія не пустая забава.

Сярод вершаў Пушкіна адзін не мог не прыкаваць увагі паэта.

Гэты верш канчаецца вечнымі словамі:

Восстань, пророк, и виждь, и внемли,
Проникнись волею моей
И, обходя моря и земли,
Глаголом жги сердца людей.

Паэт-прарок быў вельмі падобен на прарока, аб якім чытаў Бядуля ў біблії. Вялікае прызначэнне паэта праясняласся. Яно ўяўлялася як беззаветнае служэнне словам свайму народу. І верш «Мары паэта» (1912)—выражэнне факта ўсведамлення місіі паэта. Гэта ўсведамленне звязана з думкамі аб магутнай сіле паэзіі і выключнасці паэта:

З [illegible]
[illegible] я з з[illegible]
[illegible] струны я з праменняў сонца,
З яго вагністых валаконцаў.
У зоркі-ноты я ўглядацца буду,
Памкнецца з сэрца спеў да люду.
І на пажар рубінавага ўсходу
Пра лепшы лёс спяю народу.
. . . .
Я сэрца вырву, запалю паходняй—
І запануе дзень удодні.

Рамантычная прыўзнятасць, класічная в[illegible]разнасць верша, нават прысутнасць у ім [illegible]чаканага слова «арфа»—усё гэта п[illegible]крэслівае ўрачыстасць клятвы паэта.

3.

[illegible]ворчае нараджэнне З. Бядулі лічаць а[illegible]ўшымся ў 1910 годзе, калі ён надрук[illegible]ў у газеце «Наша Ніва» свой лірычн[illegible] верш у прозе «Пяюць начлежнікі».

Гэта не зусім правільна. Дакладней будзе сказаць, што гэта дата азначае пача[illegible] другога і вельмі важнага этапу ў творчасці Бядулі. Адбываецца далейшае асэнсаванне прызначэння і сацыяльнай функцыі паэта. Да таго, як пачаць друкавацца ў «Нашай Ніве», Бядуля меў [illegible] некаторы паэтычны вопыт. Ён пісаў [illegible]ычныя вершы, у якіх паказваў, што вельмі тонка адчувае прыроду і валодае назіральнасцю, неабходнай паэту.

А[illegible] галоўнае—лірыка Бядулі па сваёй тэматыцы і паэтычных сродках не адпавядала ўжо ўстанавіўшымся традыцыям «н[illegible]аніўскай» паэзіі. Паэзія «Нашай Нівы» развівалася пад знакам сацыяльнага ды[illegible]ктызма і адмаўлення ад уласна-лірычных тэм. Бядулю трэба было рашуча пераключыцца і, адмовіўшыся ад «чыстай» лірыкі, ад вобразаў рамантызма, уключыцца [illegible]агульны паток вершаў «Нашай Нівы». Гэта адпавядала думкам Бядулі аб прызначэнні паэта і яго ролі ў жыцці, але разам з тым пагражала яму страціць вызначыўшуюся ўжо лірычную ўстаноўку яго паэзіі.

Тады перад Бядулям паўстала канкрэтнае пытанне аб жанрах. Звяртае ўвагу тое, [illegible] Бядуля да 1914 года надрукаваў [illegible] «Нашай Ніве» усяго адзін верш. [illegible] ён працуе ў іншым жанры: піша кароткія навелы, апавяданні, фельетоны. У гэтыя-ж гады ён працягвае працаваць над лірычнымі вершамі, але не друкуе іх. Большасць вершаў, дацірованых гадамі 1909—1915, не паяўлялася ў газеце. Аднак работа ў газеце налажыла пэўны адбітак на далейшае развіццё паэзіі Бядулі. Радам з лірычнымі вершамі з'яўляюцца вершы, поўныя сацыяльнай накіраванасці, у якіх моцна гучыць матыў нявырашаных сацыяльных супярэчнасцей («Пан», «Ты», «Песня»); нарэшце, паяўляецца вельмі характэрны, чыста «нашаніўскі» зварот да інтэлігенцыі («Прыдзеце»).

У гэты-ж час Бядуля піша вершы, у якіх дае бытавыя замалёўкі. Бядуля ўводзіць у ткань лірычнага верша сацыяльную тэму, матыў страчанага спакою, цяжкага болю, прычына якога — абяздоленасць народа.

Ой, чаму я згубіў супакой свой раптоўна?
Ой, чаму гэтак вочы гараць непрытомна?
Ой, чаму стала сумна так мне?

На пастаўленае пытанне паэт дае адказ, які пераключае адразу тэму ўласнага неспакою на сацыяльны матыў:

Птушкай лезе ўспамін з абяздоленай вёскі,
Там замерлі жыцця галасы, адгалоскі,
Людзі сталі маўклівы, як пні.
Пазадушана ўсё пад цяжарам магілы,
Чорным крыллем бяда нават сонца займгліла.

Разам з гэтым паглыбленнем зместу лірыкі адбываецца рух семантычна-вобразнай сістэмы. Лінія гэтага руху вызначаецца схематычна так: ад рамантычна неакрэсленых слоў і вобразаў да рэалістычна-канкрэтнай вобразнасці і метафарычнасці. Гэты вельмі складаны зрух у паэзіі Бядулі нярэдка суправаджаўся спалучэннем рамантызма і рэалізма ў семантычна-эмацыянальнай структуры вершаў.

4.

Суб'ектыўна-эмацыянальны тон лірыкі З. Бядулі, рэзкая экспрэсіўнасць і эма[illegible] [illegible] тым, што жыццё тут адлюстроўваецца праз канкрэтнае пачуццё, думку, выкліканую пэўнай жыццёвай даннасцю.

Паколькі ў аснове лірычнай паэзіі няма складанага сюжэта, цэнтр цяжару пераносіцца на эмацыянальна-выразнае слова. Пагэтаму вялікае значэнне набывае адэкватнасць слова, вобраза — пачуццю, думцы, характэрная пабудова інтанацыі.

У першых вершах Бядулі адчуваецца, што галоўнае для паэта — любымі сродкамі выразіць сваё пачуццё. Эмоцыя пераважае над думкаю; вобразы прыўзнятыя, рамантычныя; фарбы выбіраюцца найбольш яркія, здзіўляючыя.

Пейзаж у вершах, адзначаных паэтыкай рамантызма, страчвае свой мясцовы каларыт. Прыродным фонам псіхалагічных адчуванняў становяцца традыцыйныя месяцы і зоркі — абавязковы атрыбут рамантычнай паэзіі. Вось тыповы ў гэтых адносінах малюнак:

Абліта ззяннем зорак росная паляна.
Застыў пад мгненне ценяў чулы зарасняк,
З-за шыза-дымнай хмары круглы месяц глянуў,
У рэчку кінуў-сыпнуў бірузовы мак.

Аднак няправільна было-б уяўляць, што ў нейкі перыяд творчасці Бядуля быў «чыстым» рамантыкам, а затым перайшоў да рэалістычнага пісьма.

Побач з вершамі, у якіх пачуццё не знаходзіць канкрэтна-рэалістычнага ўвасаблення ў слове, мы знаходзім вершы, характэрныя дакладным рэалістычным успрыняццем. Слова ў такіх вершах пазбаўляецца шматпланавасці і мае строга акрэслены сэнс. Гэтаму адпавядаюць характэрныя параўнанні, падказаныя жыццём. Бярозка апранаецца ў палатно, «курыць люльку шэры вадзянік», а месяц, які меў дэкарацыйную функцыю, «сярпом сваім жне вершаліны хвой». Як бачым, лінія рамантычная і рэалістычная ў ранняй лірыцы Бядулі ідуць паралельна. У далейшым, у самым росквіце свайго таленту, Бядуля дасягае арганічнага спалучэння гэтых асаблівасцей.

ШЛЯХІ ДАЛЕЙШАГА РАЗВІЦЦЯ МУЗЫЧНАЙ ТВОРЧАСЦІ

Прайшоўшая ў чэрвені 1940 года ў Маскве дэкада беларускага мастацтва з'явілася яркай дэманстрацыяй поспехаў ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі. Дзякуючы клопатам, увазе, чулым адносінам партыі і ўрада маладое прафесіянальнае мастацтва Беларусі, выклікапае да жыцця Кастрычніцкай рэвалюцыяй, за гады совецкай улады расцвіло, развілося і дабілася выключна вялікіх дасягненняў.

Паявіліся свае нацыянальныя оперы, балеты, сімфанічныя, камерныя, харавыя і масавыя творы. Асноўным станоўчым бокам гэтых твораў з'яўляецца іх цесная, непарыўная, арганічная сувязь з народнай беларускай песнетворчасцю. Беларускі фальклор апладатварае творчасць беларускіх кампазітараў, служыць адпраўным пунктам у іх творах. Напеўнасць, свежасць, прастата, выразнасць, народная каларытнасць—неад'емныя якасці кампазітарскай творчасці ад малых да вялікіх музычных форм. Другім, не менш істотным, фактарам з'яўляецца следванне лепшым традыцыям рускай класікі і творчасці віднейшых рускіх совецкіх кампазітараў. Гэты адзіна правільны шлях цвёрда засвоен беларускімі кампазітарамі.

Дэкада ўскалыхнула ўсіх творчых работнікаў Беларусі, стала стымулам к далейшаму росту мастацтваў. Гэта перш за ўсё адносіцца да творчых сіл заходніх абласцей, якія ўпершыню ўвайшлі ў совецкае мастацтва.

Дэкаду і яе поспехі неабходна зразумець, як авалоданне першым этапам развіцця беларускай нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па зместу культуры. Перад творчымі кампазітарскімі сіламі ў сувязі з гэтым вырастаюць новыя і яшчэ больш сур'ёзныя і складаныя задачы.

Першая з іх—асваенне тэматыкі нашай сучаснасці, сёнешняга дня, стварэнне вобразаў герояў соцыялістычнага будаўніцтва. Ні оперная, ні сімфанічная творчасць дасюль шчыльна не падышла да вырашэння гэтай важнейшай задачы.

Эпоха грамадзянскай вайны была гранічным часам, у якім працякала дзея твораў оперы («Міхась Падгорны», «У пушчах Палесся»). Цяпер у партфелі беларускага опернага тэатра апрача балета «Залатыя калоссі» Д. Кабалеўскага ёсць толькі адно лібрэта на сучасную тэму—«Апошні дзень на хутары» пісьменніка М. Клімковіча.

Другая задача—рознастойнасць жанраў. Трэба проста сказаць, што ў беларускай оперна-балетнай творчасці наяўнічае аднастайнасць тэматыкі (параўнаць хоць-бы оперу «Кветка шчасця» з балетам «Салавей», ці оперу «Міхась Падгорны» з операй «У пушчах Палесся») і жанраў. Стварэнне лірычнай, камічнай оперы і музыкальнай камедыі—надзённая неабходнасць, без якой нямысліма паспяховае далейшае развіццё музычна-тэатральнага мастацтва.

Калі ў галіне оперна-балетнай творчасці патрэбны вялікія і дзейсныя меры, дык яны яшчэ больш датычаць іншых відаў музычнага мастацтва. Сімфанічная беларуская літаратура слаба яшчэ як па колькасці, так і па якасці твораў. Яна зрабіла толькі першыя крокі па авалоданню майстэрствам. Выключаючы кампазітара В. А. Залатарова, усе астатнія аўтары трымаюць экзамен на творчую сталасць. Часта вельмі свежыя, арыгінальныя і цікавыя мыслі расплываюцца з прычыны недастатковага адчування формы і ведання сімфанічных фарбаў і прыёмаў. Зараз напісана новая. 2-я сімфонія кампазітарам Пукстам і задумана 2-я сімфонія кампазітарам Цікоцкім—гэта пачатак паслядэкадных работ, якім неабходна надаць значна большы размах. Стымуліраванне сімфанічнай творчасці таксама адна з асноўных нашых задач.

Камерная літаратура знаходзіцца ў Беларусі ў зародкавым стане, яна адстае ад усіх іншых відаў музычнага мастацтва і мала атрымлівае ўвагі з боку кампазітараў. А важнасць развіцця гэтай формы зусім відавочна. Харавая літаратура дасюль мела толькі дробныя формы і амаль не ішла далей апрацовак беларускіх песень. З усёй сур'ёзнасцю ўстае пытанне аб напісанні буйных харавых твораў, аб прыцягненні да гэтай работы лепшых творчых сіл. Асаблівую ўвагу набывае праблема стварэння совецкага рамапса, совецкай масавай лірычнай песні. Гэта праблема можа быць вырашана толькі ў самай цеснай сувязі з беларускімі совецкімі паэтамі. Поспех песні «Бывайце здаровы» кампазітара Любана і паэта Русака агульнавядомы, але ён, нажаль, пакуль не мае адпаведнага працягу і не стаў прыкладам для іншых кампазітараў і паэтаў.

Нельга прайсці міма задачы стварэння совецкага нацыянальнага рэпертуару для эстрады, найбольш масавага жанру музычнага мастацтва. Пакладзены ў гэтай галіне кампазітарамі Падкавыравым, Пукстам, Лукасам, Палонскім, Івановым, у большасці маладымі кампазітарскімі кадрамі, пачатак заслугоўвае ўвагі і эфектыўнага развіцця.

Авалоданне рознастайнасцю тэматыкі і жанраў неаддзяліма ад павышэння якасці творчасці. Узяць хоць-бы галіну апрацовак народнай беларускай песні. Большасць нашых кампазітараў, якія займаюцца апрацоўкай песень, падыходзяць да іх яшчэ вельмі прымітыўна, павярхоўна, без сапраўднага творчага мыслення. Падпісванне тэрцый пад вядучым голасам і октаў на канцоўках стала нейкім трафарэтам. Багацце, глыбіня інтанацыйна-меладычнай і ладавай, а таксама метра-рытмічнай структуры беларускай народнай песні, якія даюць столькі магчымасцей для творчага прастору, застаюцца пакуль яшчэ мала вывучанымі і таму амаль нявыкарыстанымі. Сярод напісаных масавых песень таксама шмат недаробак. Гэта ў большасці песні-«аднадзёнкі», яны не выходзяць з межаў перайманпя (і часцей зусім дрэннага перайманпя) Дунаеўскага і Покраса.

Асноўным творчым патрабаваннем з'яўляецца адшуканне кампазітарамі сваёй музыкальнай мовы. Неабходна ўпарта і старанна працаваць над перамаганнем эклектыкі, механічных уплываў, ад чаго не свабодны нават вядучыя кампазітары. Мы мяркуем, што шлях да адшукання арыгінальнай музыкальнай мовы ляжыць праз глыбокае і сур'ёзнае вывучэнне, а затым і творчае пераасэнсаванне фальклору—каштоўнейшай мастацкай крыніцы. Варта прыгадаць імёны Глінкі, Мусаргскага, Рымскага-Корсакава і інш., каб зразумець правільнасць гэтага шляху. Беларускія кампазітары, знайшоўшыя ў гэтым пытанні выхадны пункт, павінны цяпер фарміраваць свае шуканні і з узаемадзеянняў фальклору і сваіх творчых імкненняў стварыць новыя элементы музычнага выражэння.

Для кампазітараў заходніх абласцей ўстае і яшчэ адна велізарнай важнасці і значэння задача—асваенне совецкай тэматыкі. Толькі зараз па-сапраўднаму разгортваецца іх творчая дзейнасць. Ад мадэрнізіраванай, безыдэйнай ігры музыкальных фарбаў, якая культывіравалася капіталістычным грамадствам, да ідэйнага соцыялістычнага мастацтва—шлях вялікі, складаны і не лёгкі. Наколькі гэта так, можна меркаваць хоць-бы па нядаўна напісанаму твору кампазітара Фрэйдзона (сімфанічная паэма «Вызваленне»), які, выявіўшы бяспрэчнае майстэрства аўтара і арыгінальнасць яго мыслі, у той-жа час паказаў і бездапаможнасць аўтара перад паказам вобразаў Чырвонай Арміі, святкуючага вызваленага народа. Такія няўдачы будуць немінучы, калі беларускія совецкія кампазітары не акажуць таварышам з заходніх абласцей самай уважлівай і чулай дапамогі.

Барацьба за якасць нямысліма і без павышэння кампазітарскай тэхнікі, без сістэматычнай вучобы, без работы над творчым удасканаленнем.

Неабходнасць арганізацыі лекцый, вечароў музіцыравання, творчых справаздач, кваліфіцыраваных кансультацый і іншых мерапрыемстваў падказваецца самім жыццём.

Кампазітар у нашай краіне не толькі адукаваны музыкант, але і тварэц ідэйных каштоўнасцей. Марксісцка-ленінская вучоба, палітычная развітасць—ключ да правільнага разумення сваіх задач, прынцыповасці, глыбіні, змястоўнасці ў сваёй практычнай рабоце. Творчыя работнікі Беларусі знаходзяцца цяпер на новым этапе. Краіна патрабуе ад іх новых, яшчэ больш спелых і высокамастацкіх твораў, вартых вялікай сталінскай эпохі.

Н. ШЧЭГЛОЎ.

Дзіцячы сектар Дзяржаўнага выдавецтва пры СНК БССР падрыхтаваў да друку вершаваную казку Змітрака Бядулі «Мурашка-Палашка» з ілюстрацыямі мастака Н. Малевіча. Публікуем два малюнкі Н. Малевіча.

20-годдзе літаратурнай дзейнасці В. Сасюры

Сёння Совецкая Украіна адзначае 20-годдзе літаратурнай дзейнасці выдатнага украінскага паэта-ордэнаносца Владзіміра Сасюры. У сувязі з гэтым праўленне ССП БССР паслала юбіляру наступную тэлеграму:

«Сардэчна віншуем Вас з дваццацігоддзем літаратурнай дзейнасці. Ваша імя паэта-грамадзяніна, Вашы цудоўныя вершы і паэмы шырока вядомы чытачам Беларусі.

Жадаем Вам новых радасных творчых перамог на карысць украінскай соцыялістычнай культуры, на карысць вялікай радзімы».

— ⊙ —

Владзімір САСЮРА

Украіна

З кветкамі шэпчуць вятры,
песня звініць пра любоў
і над ракою, ўгары,
месячык плаваць пайшоў.
Усё забруіла кругом,
песня грыміць салаўя.
Горы маўчаць за Дняпром.
Гэта — Украіна мая.
У небе шуміць самалёт,
трактары-коні — ў палях.
нібы разліў бурных вод
цвет веснавы па садах.
Станцыі, рэйкі, гудкі,
дымам прастор забуяў,
і цягнікі, цягнікі...
Гэта — Украіна мая.
Вечна гатова да бур,
Сталіна словам жывы,
там на граніцы, як мур,
родны стаіць вартавы.
Радасць, як светач, гарыць,
шчасцем з'еднана сям'я.
Сонца і песня ўгары.
Гэта — Украіна мая.

Сполахі

Над вячэрнім морам вецер пралятае.
Дрэваў шум шаўковы, хваляў гулпрыбой,
Сполахі далёка ходзяць небакраем,
бы ідзе за морам волатаўскі бой.

Кружацца пялёсткі, промняў развітанне,
нібы навальніца, мечаў бляск ў гаю...
Так і мы з табою ў гневе і ў каханні,
так і мы з табою вечна у баю.

З украінскай мовы пераклаў К. ЦІТОЎ.

САМАДЗЕЙНАСЦЬ БЕЛАСТОКА

Беластоцкі абласны Дом народнай творчасці прарабіў вялікую арганізацыйную і выхаваўчую работу. Кіраваннем рознымі гурткамі мастацкай самадзейнасці: драматычнымі, харавымі, музычнымі, танцавальнымі занята 36 работнікаў мастацтваў. У сучасны момант у Беластоку працуе 62 гурткі самадзейнасці, у якіх 2 тысячы ўдзельнікаў, а ў вобласці — 79 гуртоў з 2-мя з паловай тысячамі ўдзельнікаў. Лепшыя з гэтых калектываў: харавыя — пры Доме народнай творчасці, пры прамкааперацыі, пры клубе чыгуначнікаў (у Беластоку), у Гродні, Скідэлі, Бельску, Саколцы, у вёсцы Задворанцы; драматычныя — пры 3-м тэкстыльным камбінаце і пры шклозаводзе ў Беластоку, у Гродні, Саколцы, Ваўкавыску, Бельску; танцавальныя — пры прамкааперацыі ў Беластоку, у Марцінкацах, Індуры. Пры Доме народнай творчасці ў Беластоку арганізаваны самадзейны сімфанічны аркестр з 24 чалавек і аркестр народных інструментаў з 20 чалавек, школа народных і заходніх танцаў і ізостудыя для самадзейных мастакоў. Пры садзейнічанні гарАНА ў Беластоку наладжана таксама дзіцячая мастацкая самадзейнасць.

У сакавіку гэтага года адбылася абласная алімпіяда мастацкай самадзейнасці, у якой прымала ўдзел звыш тысячы чалавек, затым агульнагарадская алімпіяда тэкстыльшчыкаў, алімпіяда чыгуначнікаў, абласная дзіцячая алімпіяда. Па вобласці адбылося 19 раённых аглядаў мастацкай самадзейнасці з агульнай колькасцю ўдзельнікаў — 4.000 чалавек. Была арганізавана выстаўка народнай творчасці.

Цяпер драмгурткі Беластоцкай вобласці рыхтуюцца прадэманстрыраваць свае дасягненні на надыходзячым Усесаюзным аглядзе тэатральных самадзейных калектываў.

Рад беластоцкіх калектываў тэатральнай самадзейнасці ўжо ўключан у агляд. Драмгурткі паставілі на сцэне клубаў рад твораў класікі і совецкіх драматургаў. На аглядзе драмгурткі пакажуць: «Вассу Жэлезнову» М. Горкага (драмгуртон шклозавода, кіраўнік тав. Сегаловіч), «Браты» Ф. Альшэўскай (драмгурток 18-й тэкстыльнай фабрыкі), інсцэніроўку рамана Н. Астроўскага «Як гартавалася сталь» (драмгурток Дома настаўніка, кіраўнік тав. Кавенокі), «Блакітнае і ружовае» А. Бруштэйн (драмгурток вячэрняй школы № 1, кіраўнік тав. Дэгаль), «Тэорыю Каленбрун» Э. Самуйлёнка (драмгурток вячэрняй школы № 2, кіраўнік тав. Кавенокі), «Пагрнічнікі» Біль-Белацэркоўскага (драмгурток вячэрняй школы № 3, кіраўнік тав. Судобігер), «Жыццё кліча» таго-ж аўтара (драмгурток клуба шарсцянікаў, кіраўнік тав. Сегаловіч).

Пасля арганізацыйнага перыяду стварэння самадзейных калектываў наступіў перыяд іх умацавання і павышэння мастацкага ўзроўню.

Творча растуць і кадры індывідуальных выканаўцаў. Яны актыўна рыхтуюцца да рэспубліканскага конкурса вакалістаў.

З індывідуальных выканаўцаў варта адзначыць рабочага Рубіна Зака і Соф'ю Лапа, 55-гадовую выканальніцу сялянскіх танцаў, дзяцей-танцораў Фіру Рубіну, Соню Жукоўскую, Франю Брэйтборд.

У ізостудыі працуюць таленавітыя самавучкі-жывапісцы Гендзель, Цэльнікер, Шкута, Врацлаўскі і іншыя. Расце як мастак-скульптар 30-гадовы беластоцкі каменацёс З. Грынберг. Заслугоўвае ўвагі яго скульптура «Барыкада».

Рыхтуючыся да выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці», студыйцы працуюць над тэмамі: сустрэча Чырвонай Арміі, падпольная комсамольская арганізацыя ў Заходняй Беларусі, арышт памешчыка, мінулае і сучаснае.

Работы Закрэўскага, Шкуты, Якаўчука і Краўчука былі выстаўлены на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы.

Ткачыхі і вышывальшчыцы рыхтуюць к выстаўцы «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці» рад экспанатаў, сярод якіх самымі значнымі з'яўляюцца: габелены «Сталін», вышываныя партрэты Варашылава, панно «Лявоніха», партрэты байца на кані, танкіста. На Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы прадстаўлены работы 4 ткачых і 8 вышывальшчыц Беластоцкай вобласці.

Трэба адзначыць недастатковую ўвагу разгаворнаму жанру мастацкай самадзейнасці. А колькі-ж прастору адкрываецца тут хоць-бы ў галіне папулярызацыі народных паданняў, казак, усякіх форм народнага эпасу!

Падводзячы амаль гадовыя вынікі дзейнасці Дома народнай творчасці ў Беластоку, прыходзіш к вываду, што работа гэта была станоўчай і плённай.

С. [illegible]РЭЕР.

НОВЫ СЕЗОН ОРДЭНАНОСНАГА ТЭАТРА

Сёння адкрывае свой дваццаць першы творчы сезон Дзяржаўны ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга беларускі драматычны тэатр. Да гэтага сезона ён падышоў узбагачаны вялікім творчым вопытам, набытым у часе работы над выдатнымі п'есамі беларускіх совецкіх драматургаў і творамі класікі — спектаклямі, якія былі паказаны на дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве і атрымалі высокую ацэнку грамадскасці.

Чым узбагаціць свой рэпертуар, што пакажа гледачу тэатр у новым сезоне?

Тэатр паставіць жэмчужыну сусветнай драматургіі — «Ромео і Джульету» В. Шэкспіра (пастаноўшчык — засл. артыст БССР В. Галаўчынер). Гэта будзе першы шэкспіраўскі спектакль на беларускай сцэне.

Уключана ў рэпертуар тэатра новая п'еса беларускага драматурга Кузьмы Чорнага «Ірынка», напісаная на матэрыяле жыцця працоўных былой Заходняй Беларусі.

У бліжэйшы час тэатр пакажа гледачу дзве камедыі: «Страшны суд» Шкваркіна і «Дура для другіх, разумная для сябе» Лопе дэ-Вега.

У далейшым будуць пастаўлены выдатныя творы рускай класікі, камедыі «Не было ні гроша, ды раптам алтын» А. Астроўскага і «Рэвізор» Н. Гогаля.

Намечана вялікая праграма творчай дзейнасці. Работа над радам класічных твораў узбагаціць калектыў тэатра новым творчым вопытам, дапаможа далейшаму раскрыццю акторскіх дараванняў.

Нажаль, мала ўсё-ж прадстаўлена ў рэпертуары новага сезона совецкая драматургія, у прыватнасці беларуская. Трэба спадзявацца, што тэатр здолее на працягу сезона запоўніць гэты прабел, здолее пашырыць свой рэпертуар за кошт новых твораў беларускіх драматургаў, драматургаў братніх рэспублік,—твораў аб нашай шчаслівай совецкай рэчаіснасці, аб совецкіх людзях.

Сёння, у дзень адкрыцця свайго сезона, тэатр пакажа гледачу спектакль «Салавей» Змітрака Бядулі, чый юбілей 30-гадовай літаратурнай дзейнасці адзначае сёння наша грамадскасць.

Пажадаем калектыву ордэнаноснага тэатра натхнёнай творчай дзейнасці, выдатных поспехаў у стварэнні спектакляў, узбагачаючых наша соцыялістычнае мастацтва.

— ⊙ —

Сустрэча пісьменнікаў з польскім тэатрам

25 верасня пасля спектакля «Каварства і любоў» Шылера ў беластоцкім Доме пісьменніка адбылася таварыская сустрэча творчага калектыва Дзяржаўнага Польскага тэатра БССР з беларускімі, польскімі і яўрэйскімі пісьменнікамі.

На сустрэчы прысутнічалі: сакратары абкома партыі т.т. Ігаеў, Сямёнаў, сакратар гаркома КП(б)Б тав. Тушпын, паэт-дэпутат Вярхоўнага Совета СССР Ф. Пестрак, пісьменнікі-ордэнаносцы Кандрат Крапіва, Міхась Лынькоў, Пятрусь Броўка, Пятро Глебка, паэт Максім Танк, польская пісьменніца Янiна Бранеўская, беларускія, польскія і яўрэйскія пісьменнікі.

Паэт-ордэнаносец П. Глебка, крытыкі М. Модэль, А. Кучар, Г. Вольпе, польскія пісьменнікі Ю. Равіч, А. Дэгаль падзяліліся сваімі ўражаннямі ад прагледжаных імі спектакляў «Каварства і любоў» Шылера, «Пажыццёвае» Фрэдро.

Усе аднадушна адзначылі значную культуру тэатра, яго самастойны мастацкі твар, майстэрства актораў Вашчэровіча, Міхальскай і інш., плённую работу ў тэатры выдатнага майстра сцэны Аляксандра Венгеркі.

Творчыя поспехі, работу польскага тэатра абумовілі выключныя клопаты партыі і ўрада да развіцця ўсіх нацыянальных культур, забяспечыла ленінска-сталінская нацыянальная палітыка.

В. ЦІМСКІ.

— ⊙ —

АРЦЕЛЬ ВЫШЫВАЛЬШЧЫЦ

Тры месяцы назад у Брэсце арганізавалася арцель «Народная творчасць». Спачатку ў яе ўступіла 15 вышывальшчыц, зараз лік членаў арцелі дасягнуў 170 чалавек. Арганізавана аддзяленне арцелі ў [illegible]чы Страдэч, Брэсцкага раёна, з 60 ча[illegible]. Большасць вышывальшчыц—былыя [illegible]працоўныя.

Арцель выпускае рознастайную прадукцыю: вышытыя абрусы, жаночыя блузкі, [illegible], кашулі.

Арцель налічвае дзесяткі выдатных майстроў прыгожай вышыўкі, мастакоў народных узораў.

Да народнай вышыўкі праяўляе велізарную зацікаўленасць моладзь. За прайшоўшы час майстэрству народнай вышыўкі навучылася 30 дзяўчат.

Да свята 23-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі вышывальшчыцы рыхтуюць вышыўку на тэму: «Варашылаў на кані».

І. МУРАВІЦКІ.

— ⊙ —

Конкурс на лепшую п'есу

Заканчваецца рэспубліканскі тур Усесаюзнага конкурса на лепшую п'есу.

У аргкамітэт конкурса па БССР паступіла ўжо 72 п'есы. Прыток рукапісаў асабліва ўзмацніўся за апошнія дні. Так, 30 верасня паступіла 11 твораў. П'есы гэтыя прышлі з гарадоў, сёл і вёсак усіх абласцей БССР. Напісаны яны на розных мовах. На рускай мове паступіла 43 п'есы, на беларускай—16, на яўрэйскай—11 і на польскай—2.

13 п'ес сярод прысланых—аднаактоўкі і двухактоўкі і, згодна палажэння, да конкурса не допушчаны.

Зараз ідзе азнаямленне з п'есамі. Кожная п'еса рэцэнзіруецца два разы. Да папярэдняга рэцэнзіравання іх прыцягнуты крытыкі, пісьменнікі і тэатральныя работнікі БССР.

9 кастрычніка адбудзецца пасяджэнне журы, на якім будуць падведзены вынікі конкурса.

Да 10-годдзя Тэатра оперы і балета БССР

ШЛЯХ ТЭАТРА

5 кастрычніка 1930 года адбылося афіцыяльнае адкрыццё беларускай Дзяржаўнай студыі оперы і балета. Гэтаму выдатнаму моманту папярэднічалі ўдалыя паказы оперных спектакляў, ажыццёўленых сіламі Дзяржаўнага музычнага тэхнікума ў Мінску: «Фауст» — 1928 год; «Русалка» — 1929 год, «Севільскі цырульнік»—1930 год, якія выявілі здольных спевакоў.

У стварэнні студыі вялікую ролю адыграў педагог А. П. Баначыч. Гэты чалавек усе свае сілы і энергію, а таксама велізарны вопыт спевака-артыста аддаў на карысць стварэння опернай студыі; яго ўвага і ўменне працаваць з моладдзю прынеслі велізарную карысць опернаму мастацтву БССР. Дырыжор студыі Ілья Гітгарц, хормейстар Г. Пятроў, балетмейстар Л. Крамарэўскі і канцэртмейстар Ю. Нікіціна — вось людзі, якія арганізавалі студыю.

За 10 год з студыйцаў вырасла цэлая плеяда вядучых артыстаў оперы, балета і хора, рад таварышоў атрымалі званне народных і заслужаных артыстаў рэспублікі. Гэта шырока вядомыя майстры мастацтва тт. Александроўская, Млодэк, Друкер, Балоцін, Дзянісаў, Мурамцаў, Аляксеева, Нікалаева і Васільева.

12 чэрвеня 1936 года студыя паказвае сваю першую работу — оперу Рымскага-Корсакава «Залаты пеўнік» у пастаноўцы рэжысёра Тэзаўроўскага.

«Брацца за немагчымае... гэта жарт ці бязглуздае імкненне дасягнуць таго, што недасягальна ў нашых умовах», — так гаварылі многія, адмаўляўшыя ў корані існаванне студыі.

«Цяжка паверыць, калі слухаеш оперу, спевакоў, што ў аркестры сядзяць вучні, што мы з'яўляемся сведкамі студыйнага паказу, так многа дасягненняў, так многа прыгожых момантаў...» і г. д. — вось водгукі і рэцэнзіі ў друку аб оперы «Залаты пеўнік».

Вядома, у спектаклі былі дапушчаны сур'ёзныя і грубыя памылкі, — к прыкладу, у характарыстыках дзеючых асоб: Шамаханская царыца трактавалася прадстаўніком замежнага капітала, Звездачот — прадстаўніком рускага капітала, пеўнік — сімвалам золата, грошай. Паборнікі панаваўшага ў той час РАМП'а не здолелі, вядома, асіліць геніяльнай музыкі вялікага кампазітара, але работа выканаўцаў была адзначана як вялікае дасягненне, як рост таленавітых студыйцаў.

Рэжысёр Норд і дырыжор Гітгарц у 1932 годзе ажыццявілі пастаноўку оперы «Кармен» Бізэ. У гэтым спектаклі таксама былі памылкі. У спробах наблізіць твор да суровай рэчаіснасці пастаноўшчыкам былі ўведзены ў оперу неіснуючыя ў ёй партыі: манах, ксёндз, а таксама інтэрмедыя. Гэтыя «ўстаўкі» значна знізілі музыку Бізэ, якая ніколі не патрабавала эксперыментаў падобнага парадку. Не гледзячы на гэтыя недахопы, спектакль выявіў вялікі рост выканаўцаў. Спевы і ігра Александроўскай, Салінай, Русіна і інш., а таксама танцы ў выкананні салістаў балета Дрэчына і Крамарэўскай сведчылі аб паспяховай рабоце.

У друку, сярод грамадскасці поспехі «Залатога пеўніка» і «Кармен» усё больш і больш выклікалі думку аб неабходнасці рэарганізацыі студыі ў тэатр.

І вось, 25 мая 1933 года ў памяшканні Драмтэатра БССР спектаклем «Кармен» адкрываецца беларускі Дзяржаўны тэатр оперы і балета.

К гэтаму часу былі падрыхтаваны спектаклі «Еўгеній Онегін» — рэжысёр Барысевіч, «Царская нявеста» — рэжысёр Вульф і балет «Чырвоны мак» — балетмейстар Крамарэўскі.

Увосені гэтага-ж года ў тэатр былі запрошаны артысты з братніх рэспублік, калектыў узбагаціўся новымі здольнымі сіламі.

У 1934 годзе тэатр паказвае оперу «Князь Ігар» у пастаноўцы Чэрняўскага, оперу «Пікавая дама» ў пастаноўцы Мардвінава і оперу «Севільскі цырульнік» у пастаноўцы Барысевіч. Удалы склад выканаўцаў оперы «Севільскі цырульнік» забяспечыў вялікі поспех пастаноўкі. Опера была пастаўлена 86 разоў.

1935 год. Тэатр гастраліруе па гарадах БССР. Гастролі з'явіліся вялікім творчым экзаменам для калектыва. Побач са станоўчай ацэнкай мы атрымалі сур'ёзныя заўвагі па раду спектакляў. Тэатр паступова заваёўвае любоў у гледача.

Увосені 1935 года ў тэатры адбылася прэм'ера балета «Капелія» ў пастаноўцы Лапухова і оперы «Рыгалета» ў пастаноўцы Златагорава.

Для балетнай трупы выпуск «Капеліі» з'явіўся вялікім творчым поспехам. Малады рэжысёр Златагораў у першы-ж дзень заваяваў павагу і сімпатыю ў калектыве тэатра. Златагораў, як і Мардвінаў, шмат зрабілі для выяўлення творчага аблічча прафесіянальнага тэатра. Культура рэпетыцый, знаходжанне пачуцця праўды, работа над дыкцыяй, сувязь з партнёрам — усе гэтыя элементы гучалі ў ансамблях выканаўцаў.

1936 і 1937 годы тэатр зноў гастраліруе па гарадах БССР. К гэтаму часу ў рэпертуары тэатра былі оперы «Еўгеній Онегін», «Кармен» (пастаноўка Дзіскоўскага), «Князь Ігар», «Пікавая дама», «Севільскі цырульнік», «Рыгалета», балеты «Капелія» і «Канёк-гарбунок» (пастаноўка Крамарэўскага).

У спектаклі «Тоска» (пастаноўка Златагорава) асабліва ярка вылучыліся Друкер, Каліноўскі, Бароўскі, Мегерскі.

1938 год. На сцэне ўпершыню паяўляецца совецкая опера Дзяржынскага «Ціхі Дон». Стварылі цікавыя вобразы: Аксінні — Александроўская, Сашкі—Мурамцаў, Мішука — Засецкі. Увосені таго-ж года быў пастаўлен балет «Лебядзінае возера» — пастаноўшчык Мулер, дырыжор Грубін. На жаль, сцэна (Яўрэйскі тэатр) не дала магчымасці паставіць спектакль у поўнай сіле. Усё-ж многія танцоры, як Васільева, Нікалаева, Дрэчын, былі цёпла сустрэты гледачом.

1939 год. У падарунак ад партыі і ўрада тэатр атрымлівае цудоўны новы будынак.

К гэтаму часу заканчваецца фарміраванне трупы. Маштабы сцэны абавязалі ўсіх працаваць па-новаму. У штодзённай упартай рабоце, перамагаючы ўсю складанасць асваення новага памяшкання, тэатр за 1939 год паказаў 6 пастановак: «Русалка», «Царская нявеста» (пастаноўка Рапапорта), «Міхась Падгорны» (у старой рэдакцыі, рэжысёр Літвінаў), «Бахчысарайскі фантан» (балетмейстар Галейзоўскі), «Дрыгва» (пастаноўшчык Шлепянаў) і балет «Салавей» (пастаноўка Лапухова і Ермалаева).

Паяўленне на сцэне арыгінальных беларускіх опер і балета, безумоўна, набыло велізарнае значэнне для ўсёй музычнай культуры рэспублікі.

Нельга не адзначыць велізарную грамадскую работу артыстаў Тэатра оперы і балета: шэфства над мастацкай самадзейнасцю, шырокае абслугоўванне часцей РСЧА, клубаў, ДЧА, а таксама пагранатрадаў і застаў БССР. У дні вялікага вызваленчага паходу гераічнай Чырвонай Арміі па аказанню братняй дапамогі працоўным Заходняй Беларусі, абслугоўваючы байцоў, камандзіраў і палітработнікаў РСЧА, а таксама працоўных заходніх абласцей, артысты праявілі сябе мужнымі совецкімі грамадзянамі, якія ідуць нага ў нагу з любімай Чырвонай Арміяй.

1940 год. Падрыхтоўка да дэкады ў Маскве. Усведамленне адказнасці быць прадстаўнікамі беларускага народа, быць у сталіцы совецкай краіны — дзе нас пачуе родны Сталін, патхняе нас на вялікія творчыя перамогі.

5 чэрвеня 1940 года ў памяшканні Вялікага тэатра СССР операй «Міхась Падгорны» адкрылася дэкада беларускага мастацтва. Масквічы выключна цёпла сустрэлі паказ дасягненняў беларускага опернага мастацтва.

На спектаклях «Кветка шчасця» і «Салавей» прысутнічаў таварыш Сталін, прысутнічалі кіраўнікі партыі і ўрада. Незабыўная дата, калі таварыш Сталін апладыраваў нашаму тэатру, будзе памятна на ўсё жыццё.

З вялікім поспехам прайшла опера Багатырова «У пушчах Палесся».

17 чэрвеня мы — у раскошных залах Крэмля на прыёме ў кіраўнікоў партыі і ўрада. У выключна цёплай і сяброўскай абстаноўцы прайшоў вечар, на якім прысутнічалі ўсе ўдзельнікі дэкады. Нашы ўсхваляваныя, радасныя прамовы былі прысвечаны любімаму Іосіфу Вісарыёнавічу Сталіну.

Цёпла праводзіла нас Масква. 23 чэрвеня Дзяржаўны тэатр оперы і балета БССР вярнуўся ў Мінск.

За выдатныя поспехі ў справе развіцця беларускага опернага і балетнага мастацтва наш тэатр узнагароджан ордэнам Леніна, звыш 40 чал. нашага калектыва ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі СССР.

10-гадовы шлях нашага тэатра дае найярчэйшы малюнак таго, як у краіне Советаў, у краіне Сталінскай Канстытуцыі жыве і квітнее мастацтва свабоднага беларускага народа.

Мы ўпэўнены ў тым, што ў будучай рабоце наш тэатр, замацоўваючы свае дасягненні, будзе прадаўжаць творчы рост і ў надыходзячым сезоне пакажа на сваёй сцэне з уласцівым яму майстэрствам новыя беларускія творы, лепшыя творы совецкіх кампазітараў, а таксама рускіх і заходніх класікаў.

М. ДЗЯНІСАЎ, І. БАЛОЦІН.
Заслужаныя артысты БССР.

Адказны рэдактар І. Д. ГУРСКІ.

У3547. Адрас рэдакцыі газеты: Мінск, Савецкая,76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць штотыднёва. Мінск, друкарня «Звязды».